Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 СТУДЗЕНЯ 2007 г. СЕРАДА
№ 5 (25870)
Кошт 400 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Актуальна

## РАСІЯ І БЕЛАРУСЬ АДНАВІЛІ ПЕРАГАВОРЫ ПА НАФЦЕ

Міністэрства эканамічнага развіцця і гандлю Расіі і дэлегацыя Беларусі аднавілі перагаворы па пастаўках расійскай нафты. Яны праходзяць у Маскве ў Мінэканомразвіцця, паведаміў **БЕЛТА** ў прэс-службе Пасольства Беларусі ў Расіі.

Беларускую дэлегацыю на перагаворах узначальвае намеснік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў, расійскую — міністр эканамічнага развіцця і гандлю Герман Грэф.

## СУСТРЭЧА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ ПАПЯРЭДНЕ НАМЕЧАНА НА ДРУГУЮ ПАЛОВУ ЛЮТАГА

Сення па ініцыятыве ўкраінскага боку адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Украіны. Аляксандр Лукашэнка і Віктар Юшчанка абмяняліся думкамі па актуальнай міжнароднай праблематыцы, абмеркавалі шэраг пытанняў развіцця двухбаковага беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва, далі станоўчую ацэнку дынаміцы гандлёва-эканамічных адносінаў паміж двума краінамі.

Галоўнай тэмай размовы стала будучая сустрэча лідараў Беларусі і Украіны. Бакі дамовіліся, што цяпер неабходна правесці сур'ёзную падрыхтоўку да гэтай сустрэчы, з тым каб выйсці на падпісанне важных беларуска-ўкраінскіх пагадненняў. Адпаведныя даручэнні дадзены міністэрствам замежных спраў абедзвюх краін.

Папярэдняя сустрэча Прэзідэнтаў Беларусі з украінскім калегам намечана на другую палову лютага гэтага года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## 52,9 ПРАЦЭНТА БЕЛАРУСАЎ І 44,4 ПРАЦЭНТА РАСІЯН ЛІЧАЦЬ НЕАПРАЎДАНЫМ ПАВЫШЭННЕ ЦЭН НА ГАЗ І НАФТУ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

52,9 працэнта беларусаў і 44,4 працэнта расіян лічаць неапраўданым павышэнне цэн на газ і ўвядзенне мытных пошлін на нафту для Беларусі з боку Расіі. Такія даныя атрыманы па выніках сацыялагічнага даследавання, праведзенага аналітычным цэнтрам EcooM.

Яшчэ 23,1 працэнта грамадзян Беларусі і 22,5 працэнта грамадзян Расіі на пытанне аб тым, ці апраўданы такія дзеянні расійскага ўрада, адказалі — «хутчэй, не». Такім чынам, пятэнцыяльна негатыўную ацэнку гандлёва-эканамічным мерам урада Расіі адносна Беларусі далі б больш як 70 працэнтаў жыхароў Саюзнай дзяржавы.

У той жа час меры ў адказ Беларусі па ўвядзенню дадатковай аплаты расійскай нафты, якая прапампоўваецца транзітам на Захад, адобрылі 82,6 працэнта беларусаў (57,3 працэнта — «так» і 25,3 працэнта — «хутчэй, так») і 52,4 працэнта расіян (34,6 працэнта — «так» і 17,8 працэнта — «хутчэй, так»).

Сацдаследаванне было праведзена ў Мінску і ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі, Маскве і райцэнтрах Маскоўскай вобласці, Санкт-Пецярбургу, Бранску і Смаленску. З беларускага боку былі апытаны 541 чалавек старэйшы за 18 гадоў, з расійскай — 533.

Ва ўрадзе

## Увядзенне пошліны на транзіт нафты заснавана на заканадаўстве Беларусі, уніфікаваным з РФ і СГА

Пошліна на перамяшчэнне нафты праз Беларусь па магістральных нафтаправодах уяўляе сабой збор за транспарціроўку нафты і не з'яўляецца мытным плацяжом. Яе ўвядзенне заснавана на нормах заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне знешнегандлёвай дзейнасці, уніфікаванага з заканадаўствам Расійскай Федэрацыі, так і з прынцыпамі і нормамі Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Аб гэтым гаворыцца ў каментарыі да рашэння беларускага ўрада аб увядзенні гэтай пошліны, размешчаным на афіцыйным сайце Савета Міністраў нашай краіны.

У каментарыі адзначаецца, што Беларусь — уласнік магістральных нафтаправодаў, якія праходзяць па яе тэрыторыі. У перыяд да 2007 года рэспубліка не спаганяла плацяжоў за перамяшчэнне расійскай нафты транзітам, прадастаўляючы права беларускаму апарату самастойна заключаць кантракты на транзітную транспарціроўку нафты з адказнай расійскай транспартнай кампаніяй. На такой жа камерцыйнай аснове ажыццяўлялася пастаўка расійскай нафты беларускім НПЗ.

Аднак урад РФ 8 снежня 2006 года ў аднабаковым парадку без належнага папярэдняга паведамлення беларускаму боку прыняў пастанову, у адпаведнасці з якой з 1 студзеня гэтага года на нафту, якая пастаўляецца ў Беларусь, уведзена вывазная мытная пошліна. Тым самым Расійская Федэрацыя парушыла шэраг як двух, так і шматбаковых пагадненняў аб несплачванні мытных пошлін ва ўзаемным гандлі.

Расійскаму боку было афіцыйна паведамлена аб допушчаных парушэннях прынятых на сябе міжнародных абавязацельстваў, аднак да гэтага часу адказу ў адрас Рэспублікі Беларусь не паступала.

Такія аднабаковыя дзеянні расійскага боку, акрамя парушэння нормаў міжнароднага права, разбурылі сталыя камерцыйныя сувязі і істотна пагоршылі эканамічнае становішча беларускай нафтаперапрацоўчай галіны, гаворыцца ў каментарыі Саўміна.

У гэтых умовах урад Беларусі вымушаны быў прыняць меры па прадухіленню нанясення эканамічнага ўрону нашай рэспубліцы, узнікненню дэфіцыту важнейшых паліўна-энергетычных рэсурсаў.

Пры гэтым, беларускі ўрад пастановай № 1798 ад 31 снежня 2006 года ўвёў мытнае афармленне нафты, якая перамяшчаецца праз нашу тэрыторыю магістральным нафтаправодам, без спагнання, у адрозненне ад Расійскай Федэрацыі, збораў за мытнае афармленне.

У каментарыі таксама адзначаецца, што беларускі бок гатовы весці канструктыўны дыялог па ўрэгуляванню пытанняў паставак нафты, аж да адмены ўведзеных кампенсуючых мераў пры ўстараненні прычын, што іх спарадзілі.

**БЕЛТА.**

# РУПЛІЎЦАМ ДУХУ

**Міласэрнасць, цярпімасць, уменне суперажываць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу, працавітасць і любоў да сваёй Айчыны — гэтыя хрысціянскія каштоўнасці заўсёды былі маральнай асновай беларускага народа. А праваслаўная царква — яго надзейнай апорай. Аб гэтым заявіў 8 студзеня кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння прэмій «За духоўнае адраджэнне» 2006 года і спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. На мерапрыемстве прысутнічаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**



Прэзідэнт адзначыў, што дзякуючы праваслаўнай царкве на беларускай зямлі заззяла святло асветы, з'явіліся першыя кнігі, зарадзілася мастацтва. «Сёння праваслаўе — неад'емная частка беларускай культуры, адзін з яе важнейшых духоўных вытокаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Па традыцыі менавіта ў дні святкавання Праваслаўнага Раджаства ўзнагароды атрымліваюць тыя, чыя стваральная дзейнасць у гуманітарнай сферы, выдатныя мастацкія творы атрымалі шырокае прызнанне.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў пяць прэмій «За духоўнае адраджэнне» 2006 года прадстаўнікам творчай інтэлігенцыі і духоўным асобам розных канфесій. Такую высокую ўзнагароду яны заслужылі дзякуючы сваёй нястомнай працы на карысць Айчыны па захаванню і прымнажэнню культурных багаццяў Беларусі, маральнай асвеце, умацаванню дружбы і згоды паміж людзьмі.

У ліку ўзнагароджаных — аўтарскі калектыў цыкла публікацый «У пошуках страчанага» ў складзе дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва» Аляксандра Карлюкевіча, галоўнага рэдактара газеты «Советская Белоруссия» Паўла Якубовіча і намесніка начальніка аддзела продажаў кампаніі «Ай Сі Імпекс» Уладзіміра Ліхадзедава; намеснік старшыні рэспубліканскага рэлігійнага аб'яднання «Канферэнцыя каталіцкіх епіскапаў на Беларусі», ардынарны епіскап мясцовага рэлігійнага аб'яднання «Віцебская епархія Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь» Уладзіслаў Блін, выкладчык школы катэхізатараў пры мясцовым рэлігійным аб'яднанні «Мінская епархія Беларускай праваслаўнай царквы» Барыс Ганага.

Гэтай узнагароды ўдастоены і намеснік генеральнага дырэктара ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Павел Каранеўскі, благачынны прыходаў Мядзельскай акругі мясцовага рэлігійнага аб'яднання «Мінская епархія Беларускай праваслаўнай царквы», настаяцель рэлігійнай абшчыны «Прыход храма Святой Жываначальнай Тройцы ў Мядзелі Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы» Ігар Шалуха.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, мінулы год быў удалым і плённым для майстроў беларускай культуры. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, першы год новай пяцігодкі адзначаны адкрыццём сапраўдных духоўных скарбніц — Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і новага корпуса Нацыянальнага мастацкага музея.

Беларускі лідар дадаў, што відавочным вынікам паспяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за апошнія гады стаў увод у строй шэрагу аб'ектаў культуры ў сталіцы і рэгіёнах рэспублікі.

Па выніках 2006 года заслугі выдатных работнікаў культуры адзначаны спецыяльнымі прэміямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Яны прысуджаны 14 дзеячам мастацтва, прафесійным і самадзейным творчым калектывам, музеям і бібліятэкам.

Таксама кіраўнік дзяржавы ўручыў узнагароды зорнай камандзе, якая бліскуча прадстаўляла Беларусь на дзіцячым конкурсе «Еўрабачанне». «Вось ужо два гады запар юныя беларусы скараюць Еўропу сваім талентам, абаяльнасцю», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Віншуючы ўзнагароджаных, Прэзідэнт пажадаў ім новых поспехаў і натхнення.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# АЛАДКІ НА КАЛЯДКІ



**Інжынер-лабарант Мінскага камбіната хлебапрадуктаў Ірына ІВАШКЕВІЧ — удзельніца выставак харчовых вырабаў. Яна валодае шматлікімі рэцэптамі прыгатавання смачных бліноў.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЗІМА НЕ СПЯШАЕЦЦА

**Згодна з меркаваннямі айчынных сіноптыкаў, на гэтым тыдні істотных змяненняў надвор'я не чакаецца. Паводле інфармацыі начальніка аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Валянціны Скрабец, у бліжэйшыя тры дні глыбокія цыклоны будуць рухацца з боку Атлантыкі на Скандынавію і пачнуць выносіць на тэрыторыю Беларусі вельмі цёплае паветра.**

Таму 10 студзеня тэмпература паветра павысіцца да 4—10 градусаў цяпла, а на поўначы краіны пройдуць невялікія дажджы. 11—12 студзеня на большай частцы рэспублікі зноў чакаюцца дажджы, а ў паўночнай частцы — узмацненне ветру з парывамі да 15 м/сек і больш. Тэмпература паветра ў гэтыя дні на працягу сутак будзе ад плюс 2 да 8 градусаў. Аднак ужо 12 студзеня дождж пачне чаргавацца з мокрым снегам, а сапраўды моцны вецер распаўсюдзіцца на ўсю тэрыторыю краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ПОПЫТ НА СКВ ЗМЕНШЫЎСЯ...

Мяркуючы па папярэдняй інфармацыі Нацыянальнага банка, на пачатку гэтага года — у першай дэкадзе студзеня — попыт на наяўную валюту насельніцтва ў параўнанні са снежнем мінулага года зменшыўся: у абменных пунктах цяпер людзьмі купляецца амаль удвая менш СКВ.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Журавовіч, сітуацыя на рынку наяўнай валюты пачынае стабілізавацца.Ў апошні месяц мінулага года, нагадаем, нечакана ўзрос попыт людзей на валюту. Калі ў лістападзе беларусы набылі ў «абменніках» на 70 мільёнаў долараў больш, чым прадалі, то ў снежні адмоўнае сальда куплі-продажу валюты насельніцтву ў пунктах абмену валюты вырасла ўдвая і склала каля 141 мільёна долараў (куплена было каля 513 мільёнаў долараў ЗША, прададзена ў абменныя пункты каля 372 мільёнаў). Як зазначаюць банкаўскія спецыялісты, падобная «зрухі» на наяўным рынку тлумачацца тым, што напрыканцы года ў людзей з'явіліся дадатковыя грашовыя сродкі — трынаццатая зарплата, выплата прэмій: нехта іх пераводзіў ва ўклады, а іншыя аддалі перавагу канвертацыі ў СКВ — адсюль і рост попыту на валюту. А вось на пачатку гэтага года цікавасць насельніцтва да абменных аперацый зменшылася. Як падкрэсліваюць у галоўным банку краіны, сёння дэфіцыту наяўнай валюты ў краіне не назіраецца: у абменных пунктах яе хапае. Што датычыцца магчымых хістанняў курса беларускага рубля ў бліжэйшы час, то паводле слоў некаторых спецыялістаў Нацбанка, у адносінах да долара ЗША курс нацыянальнай валюты мае ўсе шанцы яшчэ крыху ўмацавацца.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПАТРАБАВАЎ ЗА «СКІДКУ» $20 ТЫСЯЧ

Супрацоўнікамі падраздзяленняў па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама і Маскоўскага РУУС сталіцы затрыманы кіраўнік ПМК аднаго з раёнаў Міншчыны ў момант атрымання буйнога хабару.

Паводле даных упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, па дапамогу да праваахоўнікаў звярнуўся дырэктар аднаго з прыватных прадпрыемстваў, які паведаміў аб тым, што ў яго вымагаюць хабар. Як высветлілася, паправіць сваё матэрыяльнае становішча такім чынам намагаўся кіраўнік ПМК, які хацеў пабагацець на збыце экскаватара і аўтагрэйдэра, што знаходзіліся на балансе яго арганізацыі. Ведучы перамовы з камерсантам, адказная асоба знізіла першапачатковую цану за тавар у некалькі разоў, а ў якасці кампенсацыі за «скідку» кіраўнік ПМК запрасіў узнагароду ў 20 тысяч долараў ЗША. У момант атрымання грошай падазронага і затрымалі. Дарэчы, з 1 студзеня гэтага года ў мэтах узмацнення барацьбы з хабарніцтвам і іншымі злачынствамі карупцыйнай накіраванасці ў ГУУС Мінгарвыканкама, упраўленнях унутраных спраў абласных выканкамаў і УУС на транспарце створаны практычныя падраздзяленні па раскрыццю злачыстваў у стратэгічных напрамках. У іх функцыю, як адзначаюць у УІГС МУС, уваходзіць выяўленне цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў у розных сферах эканомікі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### СКАЧОК З 7-ГА ПАВЕРХА

У Оршы 27-гадовая жанчына скокнула з балкона сваёй кватэры, што на 7-м паверсе. З цяжкімі траўмамі яна была шпіталізаваная. Як сведчаць у міліцыі, і раней яна некалькі разоў спрабавала па сваёй волі пайсці з жыцця.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Погляд

# ІМІДЖ НІШТО, — ПРАГА СПАЖЫВЫ — ЎСЁ?

## Расія можа страціць не толькі імідж надзейнага партнёра, але і саюзніка

**Як ні сумна канстатаваць, але адбылося тое, чаго ўсе мы апасаліся і шчыра не жадалі: Беларусь намаганнямі расійскіх СМІ апынулася ў эпіцэнтры поўнамаштабнай інфармацыйнай вайны. Адпачыўшыя падчас дзесяцідзённых навагодніх канікулаў дзе-небудзь на «Шыншыльскіх астравах», «уладары думак» з падвоенай лютасцю кінуліся ў інфармацыйны бой за грашовыя знакі і «правую справу» расійскіх алігархаў. Масіраваная істэрыя, якая апошнім часам льецца з федэральных тэлеканалаў, каго хочаш можа збіць з панталыку. Паспрабуем яшчэ раз разабрацца, што ж адбылося на самай справе?**

Першае, што адразу трэба адзначыць, Беларусь, як бы хто зараз ні хацеў абвінаваціць нас ва ўтрыманстве, ніколі не жыла за кошт Расіі. Так, мы атрымлівалі газ па цэнах ніжэй сусветных, што і было прапісана ў адпаведным дагаворы. Аднак за гэта Расія ў сваю чаргу мела ад нас мноства дробных і не вельмі паслуг. Сярод іншага можна ўзгадаць і расійскія ваенныя базы на нашай тэрыторыі, за якія Беларусь не брала ні капейкі, і ўтрыманне заходняй мяжы Саюзнай дзяржавы, і стабільны транзіт не толькі тых жа энерганосьбітаў, але і грузаў у трэція краіны... Дарэчы, калі гаварыць пра транзіт, то важна правільна разумець, што для Беларусі, дзякуючы яе геаграфічнаму становішчу, гэта такі ж стратэгічны рэсурс, як для Расіі нафта і газ. І як ім больш эфектыўна скарыстацца, гэта ўжо наш клопат. Беларусь ніколі не падпісвала дакументаў, згодна з якімі дазваляла б некаму рабіць на нашай тэрыторыі ўсё што заўгодна... Чаму ж цяпер узнікаюць нейкія крыўды і непаразуменні?

Далей. Сёння любому разумнаму чалавеку, як у Беларусі, так і ў Расіі зразумела, што ўведзеная нашай краінай плата за транзіт нафты, гэта не чыйсьці капрыз, а вымушаная, падкрэслім, законная мера. Мера ў адказ на дзеянні расійскага боку. Напрыканцы снежня ўрад Расіі парушыў ранейшыя пагадненні і ў аднабаковым парадку адмяніў па сутнасці рэжым свабоднага гандлю з Беларуссю, калі ўвёў агульную для ўсіх пошліну на нафту для Мінска. Расійская нафта для нашых нафтаперапрацоўчых заводаў падаражэла адразу на 180 долараў за тону і ў выніку стала каштаваць даражэй, чым для Германіі! Работа беларускіх НПЗ у такіх умовах аўтаматычна станавілася стратнай.

Некаторыя эксперты мяркуюць, што Расія на такі крок пайшла наўмысна, каб падштурхнуць Беларусь да падпісання новага кантракта на пастаўкі газу і продаж 50 працэнтаў ААТ «Белтрансгаз» расійскаму «Газпраму». Маўляў, у такім выпадку пытанне з пошлінамі вырашым станоўча... Беларусь падпісала газавы кантракт. Кантракт, у выніку якога блакітнае паліва для нашай краіны падаражэла ў 2,14 раза. Мы пайшлі на гэту, паводле слоў прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага, «дрэнную здзелку» «для ўмацавання еўрапейскай энергетычнай бяспекі», і натуральна, разлічваючы на сумленнасць расійскага боку. Дарэмна. Расія як ні ў чым не бывала ў поўным складзе адправілася на працяглыя святочныя канікулы. Краіна багатая і можа сабе гэта дазволіць. Беларусам жа, каб жыць годна, працаваць трэба кожны дзень. Аднак рабіць гэта ва ўмовах, у якія загнала нас «саюзніца», з новага года стала проста немагчыма! Каб выйсці з сітуацыі, наша краіна і ўвяла цалкам апраўданыя пошліны на перапампоўванне расійскай нафты па ўласнаму нафтаправоду. Як бачым, гэты крок — следства, а не першапрычына. Вымушаны захад, каб, ні больш не менш, адстаяць незалежнасць і суверэнітэт дзяржавы.

Як заяўляюць эксперты, ад павышэння цэн на газ Расія выйграе зусім невялікія грошы, але можа згубіць стратэгічнага партнёра і саюзніка. Не сакрэт, што тыя ж ЗША шчодра фінансуюць лаяльныя ім дзяржавы ва ўсім свеце. Беларусь жа ў Расіі нічога не прасіла і нічога ад яе не атрымлівала. Відаць, акрэплай за кошт нафтадолараў расійскай імперыі ўжо не патрэбен нават шчыры «бясплатны» саюзнік. Так, з вуснаў асобных расійскіх палітыкаў, якім так і не ўдалася памыць чаравікі ў Індыйскім акіяне, апошнім часам сталі больш настойліва гучаць «прапановы» ўключыць Беларусь у склад Федэрацыі. Маўляў, вось калі станеце 8-й федэральнай акругай, тады і будзеце атрымліваць энерганосьбіты па цане Смаленскай вобласці... Такі пасыл, падмацаваны канкрэтнымі дзеяннямі ў энергетычнай сферы, яскрава сведчыць пра дрэнна прыхаваныя сапраўдныя амбіцыі пэўных колаў у кіраўніцтве Расіі. Некаторыя прыкормленыя сродкі масавай інфармацыі ў сваіх «танцах з бубнам» дайшлі проста да дзікунства. На адной з маскоўскіх радыёстанцый у прамым эфіры і на сайце днямі было праведзена беспрэцэдэнтнае апытанне. Расіянам прапаноўвалі выказаць сваю думку наконт таго, ці павінна Расія ўвесці войскі ў Беларусь для аховы нафтаправода «Дружба»? Трэба аддаць належнае расіянам: на адкрытую правакацыю новаспечаных імперыялістаў паддаліся нямногія. 71 працэнт рэспандэнтаў сказалі цвёрдае «НЕ». А вось асобныя высокія расійскія палітыкі, не ведаючы вынікаў апытання, вагаліся з адказам і ўжо потым дадавалі: «як большасць». Трывожны сігнал...

...Тым часам сітуацыя вакол паставак нафты ў Еўропу абвастраецца. Следам за Германіяй і Польшчай расійскае «чорнае золата» перастала паступаць у Славакію і Венгрыю. І тут зноў важны нюанс: трубы апусцелі не таму, што Беларусь перастала перапампоўваць нафту, як спрабаваў прадставіць справу расійскі бок, а таму, што вуглевадарод не паступае да нас з тэрыторыі РФ. А запаветная «кнопка», якая можа спыніць падачу, знаходзіцца менавіта на тэрыторыі Расіі.

Польшча папярэдзіла ўжо, што калі перабоі з пастаўкамі працягнуцца, краіна будзе закупляць танкерамі больш дарагую, але менш «палітызаваную» нафту ў Нарвегіі. «Міжнародны рынак дастаткова забяспечаны, нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы, якіх закранула гэта адключэнне, могуць забяспечыць сябе сыравінай і з іншых крыніц», — заявіў кіраўнік Міжнароднага энергетычнага агенцтва Клод Мандзіль.

У завяршэнне трэба заўважыць, што самае дарагое як у бізнэсе, так і ў палітыцы, гэта імідж надзейнага партнёра. Падобна на тое, што Расія паступова яго страчвае. І не толькі на Захадзе.

**Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.**

*(Працяг тэмы на 2-й стар.)*

ISSN 1990-763X

У люстэрку прэсы

## «У кантэксце энергетычнай бяспекі Беларусь не ў ЕС, але з ЕС»

**Заходнія сродкі масавай інфармацыі працягваюць каментаваць сітуацыю вакол «газанафтавага» канфлікту паміж Расіяй і Беларуссю.**

Амерыканская «Нью-Йорк таймс» са спасылкай на агенцтва «Асашыэйтыд прэс» надрукавала артыкул пад назвай «Беларусь абвінавачвае расійскую кампанію». Адной з асноўных высноў артыкула з'яўляецца сцвярджэнне аб тым, што нафтагазавыя спрэчкі нанеслі сур'ёзны ўрон блізкім адносінам паміж Беларуссю і Расіяй. Таксама адзначаецца, што беларускае кіраўніцтва мае статус адзінага партнёра Расіі ў процістаянні з НАТО.

Брытанская «Абсервер» у артыкуле «Карпарацыя «Крэмль» гатовая ўзяцца за Захад» піша: «Як і 12 месяцаў таму, магутны рускі мядзведзь рыкае на былога савецкага суседа, пагражаючы яму не танкамі, а больш высокімі цэнамі на газ. Як і ў выпадку з Украінай у 2006 годзе, сёлета Беларусі пагражалі спыненнем паставак у выпадку яе адмовы ад аплаты цаны, якая ўдвая перавышае ранейшы тарыф расійскай манаполіі «Газпрам»...»

Польская «Дзённік» паведамляе, што «адбылося тое, пра што мы папярэджвалі. Расія спыніла пастаўкі нафты ў Польшчу па нафтаправоду «Дружба», які ідзе праз Беларусь». Пры гэтым выданне падкрэслівае, што па гэтаму трубаправоду ў Польшчу дастаўляецца 70 працэнтаў расійскай нафты.

Адкрытая электронная газета «Форум.мск.ру» так ацэньвае сітуацыю, што склалася ў адносінах паміж дзвюма краінамі: «Лукашэнка прымае рынкавую цану на газ і ўводзіць рынкавую пошліну на нафту, не спадзеючыся больш на дружбу і ўзаемааддачу і не патрабуючы гэтага ад Расіі».

Падпісанне Беларуссю нявыгаднай здзелкі на пастаўкі газу з мэтай забеспячэння еўрапейскай энергетычнай бяспекі атрымала даволі пазітыўныя водгукі на старонках многіх еўрапейскіх выданняў. Стаўленне да адпаведнай заявы беларускага прэм'ера было суміравана наступным чынам: «У кантэксце энергетычнай бяспекі Беларусь не ў ЕС, але з ЕС».

**Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МЕРКЕЛЬ БУДЗЕ ДАБІВАЦЦА ЭНЕРГЕТЫЧНАЙ БЯСПЕКІ ДЛЯ ЕС

**Германія мае намер выкарыстаць паўгадавы тэрмін свайго старшынства ў Еўрапейскім Саюзе, каб умацаваць яго энергетычную бяспеку, сказала ўчора канцлер Германіі Ангела Меркель.**

«Для нас энергетыка зараз іграе тую ж ролю, якую ў мінулым igралі вугаль і сталь», — заявіла кіраўнік урада Германіі ў інтэрв'ю лонданскай газеце «Таймс». Паводле яе слоў, ЕС мае патрэбу ў адзінай энергетычнай палітыцы. У сувязі з гэтым, адзначыла Меркель, «нам неабходна ўпэўніцца, што Балтыйскі газапровод не накіраваны супраць Польшчы», паколькі ён абходзіць гэтую краіну. Канцлер Германіі падкрэсліла, што мае намер заняць больш жорсткую пазіцыю, чым яе папярэднік Герхард Шродэр.

Лонданская газета, між тым, падкрэслівае, што гэтыя выказванні гучаць на фоне прыпынення расійскіх нафтавых паставак праз Беларусь у некаторыя краіны ЕС з-за гандлёвага канфлікту Масквы і Мінска. Аналізуючы сітуацыю, заходнія аглядальнікі робяць акцэнт на пагрозах для энергетыкі Еўропы: «Еўропа ўсвядоміла, што ў яе няма ніякіх контраргументаў супраць дзеянняў расійскіх нафтагазавых гігантаў», — канстатуе, напрыклад, топ-менеджар фонда German Marshall Робін Шэперд на старонках газеты «Файненшл таймс». Тым часам у справу, здаецца, збіраецца ўмяшацца германская знешняя разведка BND. Яе кірарўнік Эрнст Урлаў заявіў, што «неабходна сабраць і праанализаваць усю інфармацыю, каб не дапусціць паўтарэння падобнага крызісу.

Еўракамісар па энергетыцы ЕС Андрыс Пібалгс заявіў аб недапушчальнасці дзеянняў дзяржавы, якая «не інфармуе сваіх партнёраў аб любых рашэннях, што могуць закрануць стабільнасць паставак». Нагадаем, што менавіта расійскі бок без усялякіх тлумачэнняў перастаў перапампоўваць нафту ў краіны Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Еўракамісар заклікаў як мага хутчэй знайсці рашэнне, якое задаволіла б усе бакі, і якое дапамагло б у далейшым пазбегнуць падобных сітуацый.

### У ЦЭНТРЫ БАГДАДА АДБЫЛОСЯ САМАЕ ЖОРСТКАЕ СУТЫКНЕННЕ БАЕВІКОЎ З АМЕРЫКАНСКІМІ ВОЙСКАМІ

**У сталіцы Ірака ўчора з самай раніцы пачаліся жорсткія баесутыкненні паміж сіламі амерыканскага кантынгенту і суніцкімі баевікамі, перадае CNN.**

Паводле звестак тэлеканала, асноўныя баі разгарнуліся ў ажыўленым гандлёвым квартале, які лічыцца адным з пунктаў базіравання суніцкага супраціўлення. Амерыканскім наземным сілам аказвае падтрымку авіяцыя і падраздзяленні іракскай арміі. Паводле слоў прадстаўніка камандавання арміі ЗША, яны сустрэлі сур'ёзнае супраціўленне: па амерыканцах адкрываюць агонь з мінамётаў, гранатамётаў і стралковай зброі, актыўна працуюць снайперы.

Бой, які відавочцы называюць беспрэцэдэнтным па сваёй інтэнсіўнасці і працягласці, пачаўся з нападу на іракскіх паліцэйскіх, якія выклікалі на дапамогу ваенных. Аднак баевікам таксама прыйшло падмацаванне. На ўчарашні вечар было вядома аб 50 забітых баевіках, пра страты сярод сіл кааліцыі не паведамляецца.

Нагадаем, што на сёння запланавана абвяшчэнне «новай стратэгіі» ЗША ў Іраку. Чакаецца, што Джордж Буш аб'явіць аб узмацненні амерыканскай ваеннай прысутнасці ў гэтай краіне.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 студзеня 2007 г.
№ 2 (56)

ВЫБАР БЕЛАРУСІ

# БЕЗ ІСТОТНЫХ УЗРУШЭННЯЎ

**8 студзеня ў Беларусі паспяхова прайшла праверка гатоўнасці выбарчых камісій да правядзення галасавання на выбарах у мясцовыя Саветы. 9 студзеня пачалося датэрміновае галасаванне.**

Як паведаміў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік, 8 студзеня арганізатары выбараў праверылі, як інфармацыя аб ходзе галасавання будзе перадавацца паміж камісіямі рознага ўзроўню, а потым — у Цэнтрвыбаркам. «Былі задзейнічаны тэлефонныя і факсавыя сродкі сувязі, а таксама электронная пошта... Мы змаглі правесці «штабную» вучобу, трэніроўку. Па сутнасці, змадэліравалі такую ж сітуацыю, якая будзе падчас выбараў, калі ўчастковым камісіям неабходна перадаваць бягучую інфармацыю пра іх ход. Падчас праверкі інфармацыя прайшла без затрымак усе этапы і была дастаўлена ў Цэнтрвыбаркам».

Адначасова адбывалася праверка наяўнасці на ўчастках для галасавання неабходнай дакументацыі, бюлетэняў, спісаў выбаршчыкаў, аргтэхнікі і інш. «У цэлым мы задаволены вынікамі», — адзначыў Мікалай Лазавік.

9 студзеня пачалося датэрміновае галасаванне, якое будзе праходзіць да дня выбараў. Перад пачаткам галасавання сакратар Цэнтрвыбаркама заявіў, што перадвыбарная барацьба ў краіне «праходзіць без істотных сацыяльна-палітычных узрушэнняў».

Падчас прэс-канферэнцыі, якая прайшла на мінулым тыдні, Мікалай Лазавік адзначыў, што міжнародныя арганізацыі, у прыватнасці АБСЕ, рэкамендуюць Беларусі адмяніць датэрміновае галасаванне. У той жа час іншым дзяржавам рэкамендуюць пашырыць гэтую практыку. «У ЗША самы вялікі тэрмін датэрміновага галасавання ў штаце Мантана. За 45 сутак можна галасаваць на ўчастку і за 75 сутак — па пошце. Па выніках апошніх выбараў АБСЕ рэкамендуе ЗША пашырыць практыку датэрміновага галасавання. За 75 сутак галасуюць, і гэтага яшчэ, аказваецца, мала! Тая ж самая арганізацыя рэкамендуе нам згарнуць датэрміновае галасаванне. І такія падвоеныя стандарты прасочваюцца паўсюдна. Таму, напэўна, да ўсіх рэкамендацый трэба падыходзіць вельмі крытычна. Што мы і робім.

Тыя ж рэкамендацыі, якія сапраўды накіраваны на дэмакратызацыю выбарчага працэсу, на стварэнне дадатковых умоў, якія садзейнічаюць рэалізацыі выбарчага права выбаршчыкаў, неабходна выконваць».

Сакратар Цэнтрвыбаркама дадаў таксама, што падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі працавалі каля 1300 міжнародных назіральнікаў. «У місіі АБСЕ было каля 50 назіральнікаў ад Расіі, якія як нашы калегі, як нашы сябры правялі ўнутраны маніторынг таго, як ацэньвалі самі міжнародныя назіральнікі нашы прэзідэнцкія выбары. Аказваецца, што недзе 90 працэнтаў назіральнікаў ад АБСЕ далі ацэнку «добра» і «выдатна». Але калі склалі ўсе гэтыя ацэнкі разам, чамусьці ў кіраўніцтва місіі АБСЕ ацэнка атрымалася негатыўнай».

Мікалай Лазавік адзначыў таксама, што сёння мясцовыя Саветы, у тым ліку пярвічнага ўзроўню, «маюць больш чым дастаткова правоў». «Сёння ў іх іншая праблема — недастатковая фінансава-эканамічная база для рэалізацыі ўсіх гэтых правоў і паўнамоцтваў».

Для таго, каб вырашыць гэтую праблему, паводле слоў сакратара Цэнтрвыбаркама, Міністэрства юстыцыі распрацавала праект нарматыўнага дакумента, «у адпаведнасці з якім узмацнілася б матэрыяльная база Саветаў пярвічнага ўзроўню». За кошт, у прыватнасці, замацавання за Саветамі часткі падаткаў, якія паступаюць у рэспубліканскі бюджэт.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

ПРОСТА ФАКТ

## ЛЁЗНА ЯШЧЭ БОЛЬШ!

**На сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў было прынята рашэнне аб павелічэнні агульнай плошчы райцэнтра Лёзна.**

Цяпер у гарадскія межы будуць уваходзіць 4,2 гектара зямлі, за якія раней адказваў мясцовы лясгас. Большасць з іх забудавана. Адпаведныя дакументы, як таго патрабуе заканадаўства, прадстаўляюцца ў РУП «Нацыянальнае кадастравае агенцтва» для рэгістрацыі змяненняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўстройства.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ГОМЕЛЬСКАМУ ШПІТАЛЮ — ВЫСОКУЮ ЎЗНАГАРОДУ

**У Маскве гэтымі днямі былі падведзены вынікі міжнароднага конкурсу шпіталяў ветэранаў вайны краін СНД па прафілактыцы захворванняў і рэабілітацыі ветэранаў і ўдзельнікаў лакальных канфліктаў.**

Аўтарытэтная міжнародная камісія ацэньвала дзейнасць 115 шпіталяў па дзесяці параметрах і вельмі высока ацаніла работу Гомельскага шпіталя (галоўны ўрач Леанід Друян) і прысудзіла яму другое месца. Дыплом і грашовую прэмію яму ўручыў старшыня Камітэта па справах воінаў-інтэрнацыяналістаў пры Савеце кіраўнікоў урадаў дзяржаў—удзельніц СНД, Герой Савецкага Саюза Руслан Аўшаў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# АПЕРАТЫЎНА, У РАБОЧЫМ ПАРАДКУ




Фота БЕЛТА.

**ДА ВЫБАРАЎ у мясцовыя Саветы дэпутатаў засталіся лічаныя дні... Як і меркавалася, выбарчая кампанія не прынесла сюрпрызаў і нечаканасцяў — яна праходзіць роўна і спакойна. «Нават занадта спакойна», — як выказалася ў адным з інтэрв'ю старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.**

**Праўда, нямногія задумваюцца над тым, што знешні спакой дастаткова значнай палітычнай падзеі забяспечваецца нябачнай воку, але ад гэтага не менш напружанай работай выбарчых камісій усіх узроўняў. Аб асаблівасцях правядзення выбарчай кампаніі на Міншчыне журналіст «МС» пагутарыў са старшынёй абласной камісіі па выбарах Мікалаем РОДЗІЧКІНЫМ.**

***— Як бы вы ахарактарызавалі пройдзены перыяд выбарчай кампаніі? Ці можна гаварыць пра пэўную спецыфіку Мінскай вобласці?***

— Калі ацэньваць тыя этапы выбарчай кампаніі, якія завяршыліся на сёння, можна сказаць, што праходзіла яна спакойна — гэта агульная тэндэнцыя для ўсіх абласцей.

У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам, на тэрыторыі вобласці была створана структура выбарчых камісій, у якіх на розных узроўнях задзейнічаны каля 15 тысяч чалавек. У пэўны перыяд у вобласці працавала больш за 3 тысячы ініцыятыўных груп па збору подпісаў. 4 снежня завяршыўся этап вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, а з 5 па 14 снежня праводзіліся праверачныя мерапрыемствы акружнымі і тэрытарыяльнымі камісіямі і адпаведна прымаліся рашэнні аб рэгістрацыі кандыдатаў.

У выніку на сёння мы маем 5018 зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў усіх узроўняў, хоць напачатку вылучалася 5116 прэтэндэнтаў. Гэта нармальны вынік.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)***

## СУР'ЁЗНЫХ ПАРУШЭННЯЎ НЕ ДАПУСКАЕЦЦА

**Пра гэта, гаворачы аб ходзе перадвыбарнай агітацыі, карэспандэнту «МС» паведаміў сакратар Гродзенскай абласной выбарчай камісіі Віктар ЦЫДЗІК.**

Мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па ўзгадненню з адпаведнымі выбарчымі камісіямі вызначаны памяшканні для сустрэч кандыдатаў у дэпутаты з выбаршчыкамі, а таксама выдзелены месцы для размяшчэння агітацыйных друкаваных матэрыялаў. Згодна з інфармацыяй Віктара Цыдзіка, парушэнняў у парадку вырабу лістовак не выяўлена, у абласную выбарчую камісію не паступала і скаргаў, што прэтэндэнту на дэпутацкі мандат перашкаджалі ў сустрэчы з выбаршчыкамі.

Што датычыцца скаргаў на адмову ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты, то іх было чатырнаццаць. Два чалавекі былі зарэгістраваны па рашэнню абласной выбарчай камісіі. Дзевяць скаргаў у суд засталіся без задавальнення. Найбольш распаўсюджанымі парушэннямі, з-за якіх было адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты, з'яўляліся няправільныя звесткі ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці, а таксама неправамоцнасць подпісаў грамадзян. Акрамя таго, пры рэгістрацыі ўлічвалася патрабаванне выбарчага заканадаўства, што «кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў могуць быць вылучаны грамадзяне, якія пражываюць альбо працуюць на тэрыторыі адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў, а таксама працуюць у арганізацыях, размешчаных на тэрыторыі іншага мясцовага Савета дэпутатаў, але звязаных з задавальненнем патрэб насельніцтва і сацыяльным развіццём тэрыторыі дадзенага мясцовага Савета дэпутатаў».

Сярод зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты Гродзенскага абласнога, гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў 25-га склікання — трыццаць членаў той ці іншай партыі. Па сем чалавек прадстаўляюць КПБ і БНФ, пяць — Аграрную партыю, чатыры — АГП, тры — ЛДП, два — БСДП (Грамада), па аднаму — ПКБ і Партыю працы і справядлівасці.

Найбольшая канкурэнцыя — сярод кандыдатаў у дэпутаты Гродзенскага гарадскога Савета, дзе амаль у кожнай выбарчай акрузе ёсць па два прэтэндэнты. Член гарадской выбарчай камісіі Зоя Маторына, якая дзяжурыла ў мінулую пятніцу, паведаміла, што ў той дзень адзін з кандыдатаў прыходзіў па пасведчанні для сваіх давераных асоб. Быў адзін званок ад выбаршчыка з просьбай удакладніць участак, дзе яму галасаваць. Скаргаў, што не дазволілі сустрэцца з выбаршчыкамі, не было.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Лідзія ЯРМОШЫНА:

# «ГЭТА ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НА ДЗІВА БЕСКАНФЛІКТНАЙ»



**Учора пачаўся апошні этап выбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы — галасаванне. На пытанні «МС» адказвае старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.**

— Сапраўды, на працягу пяці дзён будзе праходзіць датэрміновае галасаванне, а потым — 14 студзеня — будзе сам дзень выбараў. На наступны дзень краіна даведаецца, колькі дэпутатаў выбрана, ці ўсе Саветы сфарміраваны ў правамоцным складзе. Сама ж выбарчая кампанія прайшла спакойна і арганізавана. Яе недахопам можна лічыць недастатковую актыўнасць кандыдатаў. На жаль, выбарчая кампанія была мала заўважнай сярод выбаршчыкаў, яны практычна не назіралі перадвыбарнай агітацыі. Магчыма, на гэта паўплываў той факт, што перыяд агітацыі прыпаў на святы, і людзі былі занятыя зусім іншым. Таксама была праблема з перапоўненымі друкарнямі, і нават выбарчыя камісіі размяшчалі заказы з пэўным напружаннем, бо ў гэты час друкавалася шмат іншай прадукцыі. Тым не менш усё гэта пераадолелі.

Апошнімі днямі некаторыя кандыдаты актывізаваліся і сталі спрабаваць праводзіць сустрэчы з выбаршчыкамі. У падобных сустрэчах нікому не адмаўляецца. Так, былі пэўныя канфлікты, калі кандыдат прасіў адно памяшканне, адно месца на адкрытым паветры, а яму прапаноўвалі іншыя, аднак ніякіх перашкод для правядзення перадвыбарнай агітацыі не зафіксавана. Іншая справа, што самі кандыдаты недастаткова актыўныя. Таксама не вылучаюцца актыўнасцю і выбаршчыкі, якія не выказваюць жаданне ісці на сустрэчы з кандыдатамі.

Напрыклад, Мінскай гарадской выбарчай камісіяй па адной з акруг была арганізавана сустрэча з кандыдатамі. Аднак на сустрэчу з усімі кандыдатамі прыйшлі толькі чатыры выбаршчыкі. Таму аб вялікай цікавасці і жаданні паўдзельнічаць у палітычным жыцці як з аднаго, так і з іншага боку, казаць нельга. Дарэчы, на сайце АГП быў змешчаны зварот спадара Лябедзькі аб тым, што апазіцыйных кандыдатаў не пускаюць да грамадскасці, што месцы для сустрэч адведзены ў маладаступных або аддаленых раёнах. Аднак, паводле даных Мінскай гарадской камісіі, за ўвесь час перадвыбарнай агітацыі ад прадстаўнікоў гэтай партыі паступіў толькі адзін зварот аб прадастаўленні месца для сустрэчы з выбаршчыкамі. Прычым яна была прызначана на перадкалядны дзень. Няўжо кандыдат лічыць, што ў гэты вечар выбаршчык адарвецца ад святочнага стала і пойдзе на сустрэчу? Таму ў мяне адчуванне, што некаторыя кандыдаты наўмысна, прадастаўляючы такія нерэальныя заяўкі, жадаюць потым абвінаваціць выбарчыя камісіі ў недастатковай арганізаванасці сустрэч.

У цэлым жа любую спакойную выбарчую кампанію, якой бы яна не ўяўлялася малацікавай, можна запісаць у актыў. Адсутнасць напружання ідзе на карысць грамадству, якое, такім чынам, жыве па іншых законах. У грамадстве ўсё добра, калі палітыка стаіць на другім, а магчыма і больш далёкім месцы.

***— Ці можна выдзеліць нейкую катэгорыю кандыдатаў, якая праводзіла агітацыйную кампанію найбольш актыўна?***

— Я думаю, што не. На жаль, мы сутыкаемся з тым, што шэраг кандыдатаў увогуле адмаўляўся ад радыёэфіру, грашовых сродкаў, якія выдзяляюцца на друкаваную прадукцыю. Калі казаць аб пэўнай актыўнасці, то былі актыўнымі тыя, хто вылучаўся ўпершыню. Па-першае, ім цікава, яны жадаюць прайсці выбарчую кампанію да канца. Што ж датычыцца тых кандыдатаў, якія вылучаюцца не ў першы раз і з'яўляюцца дзеючымі дэпутатамі (а такіх амаль 50 працэнтаў), то яны, падаецца, лічаць, што іх і так добра ведаюць у выбарчай акрузе, а таму не лічаць мэтазгодным сябе рэкламаваць. Гэта не правільная пазіцыя, бо выбары заўсёды прадугледжваюць інтрыгу. Гэта гульня, няхай і палітычная. І калі ты пайшоў на выбары, то павінен рабіць выбарчую кампанію цікавай, рэкламаваць сябе, нават калі цябе ведаюць усе. Думаю, любая адмова няправільная. Гэта стала інерцыяй старога мышлення, якое існуе ў шэрагу кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў. На парламенцкіх выбарах кандыдаты паводзяць сябе цалкам інакш.

***— Апазіцыя ўжо называла гэту выбарчую кампанію беспрэцэдэнтнай па колькасці парушэнняў. Колькі да вас паступала скаргаў?***

— Скаргаў было вельмі няшмат, па меншай меры ў Цэнтральную камісію. У цэлым — каля ста. Прычым большая частка звязана з выбарамі толькі ўскосна: гэта звароты грамадзян, якія спрабуюць вырашыць нейкія праблемы як уласнага, так і грамадскага характару, выказваючы незадаволенасць працай пэўнага Савета. Існуюць таксама звароты, звязаныя з тлумачэннем выбарчага заканадаўства. Калі ж казаць аб выбарчых спрэчках, скаргах на выбарчыя камісіі, то іх не больш сарака. Так, мелі месца звароты ў абласныя выбарчыя камісіі, у суд. Але я магу сказаць, што тут можна казаць аб нейкай шматколькаснасці толькі ў адносінах да аднаго рэгіёна — Віцебскай вобласці, дзе ў абласную камісію паступіла 27 скаргаў, а затым значная іх частка перададзена ў абласны суд. Астатнія рэгіёны, у тым ліку і Мінск, — гэта 3—4 скаргі. Гэта выбарчая кампанія з'яўляецца на здзіўленне бесканфліктнай.

***— Адна са скаргаў апазіцыі — немагчымасць надрукаваць агітацыйныя матэрыялы.***

— Гэта праблема закранула кандыдатаў у той жа меры, што і выбарчыя камісіі. Пераднавагоднія святы выклікалі праблемы з друкаваннем. Па Мінску паступалі скаргі ад выбаршчыкаў, што адсутнічала наглядная агітацыя. Аказалася, што і Мінская гарадская камісія не змагла своечасова надрукаваць агульныя інфармацыйныя лістоўкі з данымі аб усіх кандыдатах. Таму праблемы былі не выбарачныя, а агульныя для ўсіх. Тым не менш усе яны вырашаны.

***— Ці лічыце вы выбарчую кампанію апазіцыі няўдалай, як аб гэтым казаў Аляксандр Мілінкевіч?***

— Думаю, так. Дарэчы, апазіцыйныя кандыдаты сталі здымаць свае кандыдатуры. Усяго на панядзелак 51 кандыдат падаў заяву з просьбай адмяніць сваю рэгістрацыю. Частка растлумачыла прычыны, частка — не. Аднак можна сказаць, што большая частка заяў пададзена па няўважлівых прычынах. Тое, што апазіцыя працавала слаба, дрэнна, неактыўна — так. Больш таго, парушаючы закон. Калі кандыдат ад апазіцыі скардзіцца ў Цэнтральную камісію на адмову друкаваць яго лістоўку і прыкладае яе тэкст, які не мае нічога агульнага з перадвыбарнай агітацыяй і распальвае палітычную і сацыяльную варожасць, то на каго можна скардзіцца, як не на самога сябе. Было некалькі падобных выступленняў і па радыё. Выбары ж прадугледжваюць карэктныя паводзіны ўсіх удзельнікаў: як выбарчых камісій, так і саміх кандыдатаў.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)***

АДНО АКНО

# ПАВЕЛІЧЭННЕ ШТАТУ ЖЫЦЦЁВА НЕАБХОДНА

**Мінулым летам на базе двух сельскіх Саветаў — Сеніцкага і Ждановіцкага — прайшоў абласны семінар-вучоба па рабоце са зваротамі грамадзян. Сёння абодва памянёныя Саветы — раённыя лідары па ўкараненню прынцыпу «аднаго акна». Пра сеніцкі варыянт арганізацыі работы мясцовай улады «МС» пісала напрыканцы мінулага года. Цяпер мы папрасілі падзяліцца карысным вопытам старшыню Ждановіцкага сельскага Савета дэпутатаў Валерыя Маскалёва.**

— Мы даўно працавалі па прынцыпу «аднаго акна», — расказвае Валерый Віктаравіч. — Усе даведкі заўсёды выдавалі ў дзень звароту. А вось каб «укладвацца» ў тэрміны прыняцця рашэнняў сельвыканкама, агавораныя ў Дырэктыве № 2 «Аб удасканаленні работы з насельніцтвам» і ва Указе № 432 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленню работы з грамадзянамі ў дзяржаўных органах, іншых дзяржаўных арганізацыях», пасяджэнні сельскага выканаўчага камітэта мы пачалі праводзіць два разы на месяц, а калі патрэбна, то і часцей. Шмат пытанняў у нас звычайна бывае па ўвядзенню жылых дамоў індывідуальнай забудовы ў эксплуатацыю, па афармленню папер для рэгістрацыі зямельных участкаў у Мінскім абласным кадастравым агенцтве. Яшчэ год таму мы адрэгулявалі сістэму ўзаемадзеяння з азначаным агенцтвам і з той пары ніякіх збояў пры рашэнні зямельных пытанняў не ўзнікае. Гэта ўлічваючы, што толькі за 2006 год наш сельвыканкам прыняў больш за тысячу зваротаў грамадзян менавіта па пытаннях землеўпарадкавання. Найчасцей мясцовыя жыхары звяртаюцца па пытаннях рэгістрацыі капітальных пабудоў і іх перапланіровак, дазволу на будаўніцтва і пастаноўкі на ўлік, як маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Усяго за мінулы год работнікі Ждановіцкага сельвыканкама выдалі каля 5000 даведак. Значна спрасціла іх працу камп'ютарная база даных, якая была створана мінулым летам як адзін з вынікаў правядзення семінара. Яна ўтрымлівае звыш 5 тысяч асабовых рахункаў і дазваляе, ведаючы прозвішча грамадзяніна, адразу знайсці яго адрас, склад сям'і і г.д. Усё гэта вельмі зручна пры афармленні даведак. У сельвыканкаме ёсць свая электронная пошта і электронная сетка, якой «закальцаваны» загс, землеўпарадчык, сакратар, пашпартыст, намеснік старшыні (што таксама паскарае работу з дакументамі).

Спецыфікай Ждановіцкага сельскага Савета з'яўляецца яго прыгараднае размяшчэнне і вялікая колькасць насельніцтва: у 15 населеных пунктах пражывае 12,5 тысячы чалавек. Гэта толькі прапісаных. Рэальная лічба амаль утрая большая. Многія з жыхароў працуюць у Мінску і ад сваіх мясцовых уладаў чакаюць выканання сацыяльных стандартаў на ўзроўні сталіцы.

— Наш сельскі Савет мае самы буйны сектар індывідуальнай забудовы ў вобласці, — працягвае старшыня, — таму натуральна, што нашых людзей найчасцей хвалююць пытанні зямельнага і прыродаахоўчага заканадаўства, тым больш што практычна ўся тэрыторыя сельсавета знаходзіцца ў ахоўнай зоне Заслаўскага вадасховішча.

Ёсць у сельскім Савеце і праблемы са станам дарог на ўнутрывясковых вуліцах. Сродкаў, прадугледжаных у бюджэце на добраўпарадкаванне, на ўсе патрэбы не хапае. «На 2007 год менавіта на добраўпарадкаванне ў бюджэт нашага Савета закладзена 29 мільёнаў рублёў, — прыводзіць лічбы Валерый Віктаравіч. — Пра які рамонт дарог можа ісці гаворка, калі адзін кіламетр асфальтавага пакрыцця ў цэнах мінулага года каштуе 100 мільёнаў рублёў? Упарадкаванне і будаўніцтва дарог мы вядзём пры ўдзеле мясцовых жыхароў, якія займаюцца ўзвядзеннем індывідуальнага жылля. Што датычыцца грэйдзіравання, мы падпісалі дагаворы з дзвюма дарожнымі службамі, але яны выконваюць свае абавязкі перад намі толькі пасля таго, як справяцца са сваім аб'ёмам работ».

Выклікалі незадаволенасць мясцовых жыхароў і аварыйныя дрэвы. На іх ліквідацыю сельвыканкам таксама выдаткоўваў сродкі са свайго сціплага бюджэту.

Былі складанасці з будаўніцтвам інжынерных сетак. За апошні год на тэрыторыі сельсавета пракладзена каля 40 кіламетраў сетак газазабеспячэння. У любым населеным пункце, дзе б ні праводзіўся арганізацыйны сход па пытанню газіфікацыі, абавязкова знаходзіліся людзі, якія выступалі супраць і абяцалі паскардзіцца ў аблвыканкам ці ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Іх мясцовыя жыхары называюць «дачнікамі» — гэта грамадзяне, якія маюць жыллё ў сталіцы, а сельскі дом атрымалі ў спадчыну і прыязджаюць туды толькі на лета. Ім шкада грошай на падвядзенне газу, ды ён ім і не патрэбны (зімой яны вяртаюцца ў цёплыя мінскія кватэры). Вось яны і збіваюць з панталыку астатніх жыхароў. Але ж пастаянныя жыхары заўсёды падтрымліваюць рашэнне мясцовых улад.

— Сельскі Савет — гэта орган мясцовай улады, які павінен працаваць з грамадзянамі па вырашэнню іх бягучых праблем, — разважае Валерый Віктаравіч, — а нам даводзіцца займацца і гаспадарчай дзейнасцю.

У мінулым годзе на добраўпарадкаванне ў бюджэт Ждановіцкага сельскага Савета было закладзена 50 мільёнаў рублёў. Рэальныя расходы склалі 90 мільёнаў. А ў 2005-м Савет знайшоў і выкарыстаў на добраўпарадкаванне 280 мільёнаў рублёў.

— Справа ў тым, што з 2006 года мы перайшлі на працу з казначэйствам, акрамя таго нам адмянілі разавы збор на стварэнне інфраструктуры. У фінансавым плане працаваць стала складаней, але мы прывыклі, — тлумачыць старшыня. — Сёння па падтрымку звяртаемся ва ўсе мясцовыя арганізацыі і з іх кіраўнікамі заўсёды знаходзім поўнае паразуменне.

> Зараз у сельвыканкаме 7,5 стаўкі. Як забяспечыць работу такім чынам, каб згодна з Дырэктывай № 2 весці прыём грамадзян кожны дзень да 20.00, у тым ліку ў суботу і (ці) у нядзелю? І пры гэтым не парушыць Працоўны кодэкс?

...Знаёмства з работай Ждановіцкага сельскага Савета пачынаецца з уваходных дзвярэй, дзе ўказаны графік прыёму грамадзян. «Улічваючы рэалізацыю Дырэктывы № 2, графік у бліжэйшы час змяніцца, — адзначыў старшыня. — Мы адкарэктуем яго для большай зручнасці насельніцтва».

На першым паверсе размяшчаюцца інфармацыйныя стэнды, дзе прыведзена структура Савета і сельвыканкама, пералік адміністрацыйных працэдур, якія выконвае Савет, структура Мінскіх раённага і абласнога выканкамаў, а таксама спецыялізаваных арганізацый, пэўным чынам звязаных з работай са зваротамі грамадзян.

За 2004 год у Ждановіцкі сельвыканкам паступіла 6889 зваротаў, за 2005-ы — 9392. Перавысіў 9-тысячную адзнаку і мінулы год.

— У апошнія гады ў нас назіраецца тэндэнцыя да павелічэння дакументаабароту, — падсумоўвае Маскалёў. — Калі ў 2001 годзе мы выдалі 1,5 тысячы даведак, то ў мінулым — 5 тысяч. Гэта аб'ектыўная з'ява, абумоўленая прыняццем шэрагу новых дзяржаўных нарматыўных актаў. Для выканання такіх аб'ёмаў нам жыццёва неабходна пашырэнне штату. Зараз у сельвыканкаме 7,5 стаўкі. Як забяспечыць работу такім чынам, каб згодна з Дырэктывай № 2 весці прыём грамадзян кожны дзень да 20.00, у тым ліку ў суботу і (ці) у нядзелю? І пры гэтым не парушыць Працоўны кодэкс? Калі ў штаце 2 натарыусы, яны могуць «прыкрываць» адзін аднаго: першы працуе з 8.00 да 17.00, другі — з 11.00 да 20.00. А хто заменіць сакратара? Простую даведку ў нас можа выдаць любы работнік выканкама — усе яны ведаюць, як гэта рабіць. А вось рашэнне пасяджэння выканкама ніхто, акрамя сакратара, не аформіць (там ідзе «скразная» нумарацыя).

Асабліва варта сказаць пра работу з дакументамі пашпартнага рэжыму. За мінулы год мы прапісалі 1700 і выпісалі 800 чалавек. Гэта прыкладна 30 чалавек у кожны дзень прыёму пашпартысткі толькі па пытаннях прапіскі. Калі б у штаце выканкама была яшчэ адна стаўка, мы б узялі яшчэ аднаго справавода (наш працуе на 0,5 стаўкі) і больш эфектыўна наладзілі б работу з грамадзянамі. Акрамя таго, было б добра мець у штаце і сваіх архітэктара і юрыста. Паверце, без справы яны ў нас не сядзелі б.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

*Мінскі раён.*

# АПЕРАТЫЎНА, У РАБОЧЫМ ПАРАДКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).

***— Калі мець на ўвазе, што ў вобласці налічваецца 4721 выбарчая акруга, вострай канкурэнцыі на выбарах не чакаецца?..***

— Барацьба за дэпутацкія мандаты з самага пачатку не была відавочнай, асабліва па сельскіх выбарчых акругах, якіх у нас больш за 3,5 тысячы. Зыходзячы з гэтай лічбы і маючы на ўвазе, што прэтэндэнтаў на статус кандыдата ў дэпутаты на самым пачатку «дыстанцыі» налічвалася, як я казаў ужо, 5116 чалавек, можна было зрабіць выснову аб узроўні канкурэнцыі...

Падчас праверачнага этапу 94 прэтэндэнтам адмовілі ў рэгістрацыі, а крыху пазней з-за шэрагу абставінаў, якія ўзніклі, перадвыбарную дыстанцыю пакінулі яшчэ некалькі чалавек — у выніку засталося 5018 кандыдатаў у дэпутаты на 4721 акругу. У прынцыпе, суадносіны прыкладна такія ж, як і ў іншых рэгіёнах.

Найбольш актыўна перадвыбарчая кампанія праходзіць у горадзе абласнога падпарадкавання Жодзіне, такіх буйных рэгіёнах, як Барысаўскі, Салігорскі, Маладзечанскі, Слуцкі, Вілейскі, Пухавіцкі і, канешне ж, Мінскі раёны. Я маю на ўвазе актыўнасць як на стадыі арганізацыі выбарчай кампаніі, так і на стадыі агітацыйнай дзейнасці, якая адбываецца ў дадзены момант. Але ў цэлым па вобласці ўзровень канкурэнцыі невысокі, што гаворыць у першую чаргу аб невысокай актыўнасці палітычных партый. У Саветы ўсіх узроўняў вылучыліся ўсяго толькі 42 іх прадстаўнікі.

Хоць у тым жа Калодзішчынскім сельскім Савеце ўзровень канкурэнцыі на адно дэпутацкае месца вышэйшы, чым у сярэднім па Мінскім раёне. Прыгарад ёсць прыгарад, тут зусім іншы ў параўнанні з «глыбінкай» менталітэт і зусім іншае стаўленне да падзей грамадскага і палітычнага жыцця. Але ж у большасці рэгіёнаў, асабліва ў сельскай мясцовасці, дзе няма структурных партыйных адгалінаванняў, прэтэндэнтаў у кандыдаты вылучалася мала. Ну, не будуць жа весці вострую канкурэнтную барацьбу за дэпутацкі мандат працоўныя калектывы адной мясцовасці — яны зацікаўлены вылучыць аднаго, самага вартага, кандыдата.

***— Напэўна, у сувязі з адсутнасцю вострых перадвыбарных баталій і колькасць скаргаў, што паступілі ў абласную выбарчую камісію, была невялікай?***

— З таго часу, як абласная камісія прыступіла да сваіх паўнамоцтваў, на яе пасяджэннях было разгледжана 9 скаргаў, якія датычыліся правамоцнасці дзеяння ніжэйстаячых выбарчых камісій. 4 скаргі паступілі да нас у перыяд рэгістрацыі ініцыятыўных груп і 5 — падчас рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. Ва ўсіх гэтых выпадках рашэнні ніжэйстаячых камісій былі прызнаны правамоцнымі. У цэлым жа па вобласці ў выбарчыя камісіі паступіла ўсяго 18 скаргаў — усе яны разглядаліся вельмі аператыўна, у рабочым парадку. У свой час абласная выбарчая камісія паставіла задачу перад ніжэйстаячымі структурамі: улічваючы маштабнасць і, так бы мовіць, грувасткасць гэтай кампаніі, весці скрупулёзнае дакументаванне ўсіх працэдур. Дакладна афармляць пратаколы вылучэння, у адпаведнасці з літарай закона прымаць спісы з подпісамі ў падтрымку прэтэндэнтаў, пакеты дакументаў ад палітычных партый і да т.п. І гэта спрацавала. У выніку нават тыя людзі, якія прыходзілі са сваёй крыўдай з нагоды таго ці іншага рашэння, вымушаны былі ўрэшце рэшт з ім пагадзіцца. Ды і як не пагадзіцца з тым, што мае пад сабой трывалую прававую аснову і адпавядае нормам Выбарчага кодэкса?

***— А які перадвыбарны этап вы лічыце найбольш складаным?***

— Зыходзячы з таго, што мы вызначыліся з характарыстыкай кампаніі ў цэлым, назваўшы яе спакойнай і прадказальнай, я не стаў бы тут вылучаць той ці іншы перыяд, падлічваць усплёскі актыўнасці або выбухі негатыўных эмоцый...

Цяпер, як вядома, праходзіць агітацыйны перыяд, які заўсёды, падчас любой кампаніі, лічыцца няпростым. І нашы кандыдаты ў дэпутаты маюць права — у адпаведнасці са сваім статусам — на правядзенне пэўных акцый.

Да гэтага часу ўсімі выканаўчымі камітэтамі былі вызначаны памяшканні, дзе можна правесці сустрэчы з кандыдатамі ў дэпутаты, месцы, дзе яны могуць размясціць свае агітацыйныя матэрыялы — друкаваную прадукцыю, на выраб якой выдзяляюцца пэўныя дзяржаўныя сродкі (ад 1 базавай велічыні кандыдату ў дэпутаты сельскага Савета да 8 базавых велічынь кандыдату ў дэпутаты абласнога Савета). На гэтыя грошы можна аддрукаваць пэўную колькасць агітацыйных лістовак, буклетаў і да т.п. Да таго ж, кандыдаты ў дэпутаты абласнога Савета атрымалі права выступіць на радыёстанцыі «Сталіца». З зарэгістраваных 82 кандыдатаў у дэпутаты дадзенага ўзроўню пажадалі выказацца на хвалях «Сталіцы» толькі 17 чалавек. Усе астатнія кандыдаты, якія балатуюцца ў абласны Савет, вырашылі скарыстацца рэгіянальным, мясцовым радыёвяшчаннем... Дарэчы, як і кандыдаты ў дэпутаты раённых Саветаў.

***— Днямі, уключыўшы радыёстанцыю «Сталіца», пачула шмат «цікавага» ад аднаго з кандыдатаў у дэпутаты — яго перадвыбарная праграма зводзілася да высновы, што жывём мы ў краіне без будучыні, а ён гэту будучыню нам дасць...***

— Канешне, выбарчая палеміка мае права на існаванне, і яна ідзе... Асобныя кандыдаты ў дэпутаты ў сваіх лістоўках ці выступленнях дастаткова эмацыянальна выказваюць нязгоду з тымі ці іншымі дзеяннямі ўладаў або наракаюць на хібы ў правядзенні выбарчых кампаній... Але, калі пры гэтым не парушаюцца пэўныя заканадаўчыя нормы, такія звароты маюць права быць. Хоць, паўтаруся, пераважаюць ураўнаважаныя, спакойныя выступленні. Роўныя правы весці агітацыйную работу прадастаўлены сёння ўсім кандыдатам — у той меры, у якой гэта дазваляе закон. Паўнату і роўнасць выкарыстання правоў кантралююць адпаведныя выбарчыя камісіі. На сёння ніякіх сігналаў аб грубых парушэннях у вядзенні агітацыйнай работы — скажам, аб выкарыстанні заклікаў да насілля, пагроз канстытуцыйнаму ладу, неадэкватных выказванняў у адрас іншых кандыдатаў — да нас не паступала.

***— Удзел у выбарах могуць прымаць і грамадзяне Расійскай Федэрацыі. Ці выкарыстаў хто-небудзь з іх такую магчымасць?***

— У нас у вобласці зарэгістраваны два кандыдаты ў дэпутаты, якія з'яўляюцца грамадзянамі Расіі, але пражываюць на нашай тэрыторыі. Адзін з іх балатуецца ў раённы Савет, другі — у сельскі. Такая ж магчымасць — удзельнічаць у выбарах, вылучацца кандыдатам у дэпутаты — прадастаўляецца ў Расійскай Федэрацыі грамадзянам Беларусі. І толькі выбаршчыкі маюць права вырашаць, быць ім дэпутатамі ці не быць.

***— Сёння ўжо можна сказаць аб тым, у якой ступені адновіцца дэпутацкі корпус Мінскай вобласці?***

— Я магу сказаць, што прыкладна 44 працэнты цяперашніх кандыдатаў раней ужо былі дэпутатамі і маюць вопыт работы ў гэтым накірунку. Тэарэтычна астатнія 56 працэнтаў «належаць» тым, хто выбіраецца дэпутатам упершыню. Канешне, дакладна аб працэнтных суадносінах першых і другіх можна будзе гаварыць толькі пасля выбараў, але сёння закладзены «патэнцыял аднаўлення» перавышае палову. А што ўрэшце пераможа — вопыт ці маладосць — даведаемся пасля 14 студзеня.

**Гутарыла Наталля КАРПЕНКА.**

# «ГЭТА ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НАДЗІВА БЕСКАНФЛІКТНАЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).

***— На мінулых выбарах датэрмінова прагаласавала больш за 20 працэнтаў выбаршчыкаў. Ці могуць неафіцыйныя пераможцы стаць вядомымі па некаторых акругах яшчэ да дня асноўнага галасавання?***

— Каб стаць дэпутатам, неабходны ўдзел у выбарах 50 працэнтаў выбаршчыкаў. Наўрад ці недзе гэта адбудзецца. А калі і адбудзецца, чаму не? У асобным рэгіёне ўсе могуць ведаць кандыдата і праявіць актыўнасць. Аднак нельга казаць, што гэта паўплывае на выбары ў цэлым. Усё ж такі большая частка выбаршчыкаў прагаласуе 14 студзеня. Хоць трэба адзначыць, што гэты перыяд з'яўляецца складаным, бо могуць узнікнуць праблемы з яўкай студэнцкай моладзі, значная частка якой цяпер не знаходзіцца па месцы вучобы.

***— Вы ўжо казалі, што цікавасць да выбараў панізіў Новы год. Ці знізіла цікавасць да іх «газавае пытанне»?***

— Інфармацыйная цікавасць да «газавага пытання» значна большая, чым да выбараў. Гэтае пытанне адсунула нават Новы год. Людзі ў першую чаргу чакалі паведамлення аб падпісанні дагавора, а потым ужо Новага года. Краіна жадае святкаваць і выбіраць, калі ўсё добра з іншым. Тым не менш не трэба забываць, што праходзяць менавіта мясцовыя выбары, да якіх традыцыйна цікавасць не бывае занадта вялікай. Да гэтага неабходна ставіцца нармальна. Цікавасць да такіх палітычных працэсаў моцная толькі ў палітызаваным грамадстве. А наша грамадства не вельмі палітызавана. Хоць падчас, напрыклад, прэзідэнцкіх выбараў, калі вырашаецца лёс краіны, палітызаванасць можа павысіцца. Мясцовыя выбары — не лёсавызначальныя. Так, гэта важнае мерапрыемства, нават, лічу, галоўнае палітычнае ў гэтым годзе, бо наступныя выбары павінны прайсці толькі ў кастрычніку 2008 года. Аднак да мясцовых выбараў стаўленне спакойнае, не як да глабальных пытанняў.

***— Калі будуць вядомы першыя вынікі выбараў і больш-менш канчатковыя?***

— Першы вынік — яўка выбаршчыкаў. 14 студзеня мы будзем кожныя дзве гадзіны атрымліваць з рэгіёнаў па электроннай пошце даныя пра яўку. У 20 гадзін зачыняцца выбарчыя ўчасткі. Недзе ў 22 гадзіны стане вядома агульная колькасць грамадзян, якія ўзялі ўдзел у выбарах. Астатнія статыстычныя даныя — а выбрана будзе вельмі вялікая колькасць дэпутатаў — напэўна стануць вядомыя недзе раніцай.

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

ЕСЛИ ТЫ ДЕПУТАТ

# ПОЧЕТНАЯ ПРИВИЛЕГИЯ ИЛИ НЕЛЕГКИЙ ТРУД?

(Продолжение. Начало в номере за 5 января).

## Ни дня без своего представителя

Полномочия депутата начинаются со дня принятия местным Советом решения об их признании. Таким образом, обеспечивается преемственность депутатского мандата: ни одного дня избиратели не остаются без своего представителя в Совете. Заканчиваются полномочия депутата в день открытия первой сессии местного Совета депутатов нового созыва.

Почему законодатель придает столь важное значение моменту возникновения депутатских полномочий? Дело в том, что с этого момента у депутата в полном объеме возникают права и обязанности, предусмотренные Законом «О статусе депутата местного Совета депутатов». С этого момента на него распространяются и предусмотренные гарантии депутатской деятельности.

Депутат имеет удостоверение и нагрудный знак депутата, которые ему выдаются после признания Советом его полномочий. Депутатским удостоверением и нагрудным знаком депутат пользуется в течение всего срока своих полномочий.

Депутатское удостоверение и нагрудный знак депутата являются свидетельством избрания лица в представительный государственный орган, выражением того факта, что это лицо облечено высоким доверием своих избирателей, налагает на депутата ответственность за свое личное поведение на производстве, в общественных местах, в быту, обязывает его показывать личный пример выполнения своего государственного и гражданского долга.

Обязанность депутата — активное участие в работе Совета, образуемых им постоянных комиссий и других органов, в состав которых он избран или входит по должности. Он обязан выполнять поручения Совета и его органов.

Местный Совет вправе заслушать сообщение депутата о его работе в Совете, о выполнении им решений и поручений Совета и его органов.

Депутат вправе участвовать с правом совещательного голоса в работе сессий других местных Советов и их органов при принятии или решений, затрагивающих интересы населения, проживающего на территории того Совета, в состав которого он избран.

Одной из важнейших обязанностей депутата является его участие в работе сессий Совета. Только весьма уважительные обстоятельства могут послужить причиной неявки депутата на сессию Совета. При этом он обязан заблаговременно уведомить президиум Совета или председателя Совета (письменно или по телефону). Отсутствие депутата на сессии по причинам, которые не могут считаться уважительными, следует рассматривать как прямое невыполнение своего долга перед избирателями и перед Советом.

Сессия — основная организационно-правовая форма деятельности местного Совета депутатов. Именно здесь депутат имеет возможность наиболее полно представлять волю и интересы своих избирателей. Регулярное посещение депутатом сессий Совета дает ему возможность быть в курсе всей деятельности Совета и его органов, оказывать влияние на принимаемые Советом решения как в общегосударственных интересах, так и в интересах своих избирателей.

Необходимо добиваться регулярного созыва сессий, значительно расширять круг вопросов, рассматриваемых на них. Сессии должны проводиться не для парада и формально-торжественного одобрения намеченных мероприятий, а для делового обсуждения и решения актуальных вопросов хозяйственной и иной жизни области, города, района, поселка, сельсовета.

Действенное средство осуществления депутатами своих полномочий — депутатский запрос на сессии Совета. Депутатский запрос — это сильное средство контроля со стороны депутатов, да и Совета в целом, за осуществлением планов, решений, законов, наказов избирателей, за осуществлением прав и интересов граждан, это острое оружие в борьбе с негативными явлениями в работе органов управления. При заинтересованном, творческим подходе к депутатским запросам они станут важным стимулом активизации народных избранников и мощной формой борьбы с недостатками.

Депутат вправе обратиться на сессии с письменным запросом к президиуму Совета, председателю Совета, исполнительному комитету, руководителям его структурных подразделений, а также к руководителям или владельцам любых расположенных на территории Совета предприятий, учреждений и организаций по вопросам, отнесенным к ведению соответствующего Совета или затрагивающим его интересы. Запрос включается в повестку дня сессии.

Инициативы внесения запроса обычно принадлежит депутату, но он может сделать это и по просьбе избирателей, трудовых коллективов и общественных объединений, выдвинувших его кандидатом в депутаты, или коллективов предприятий, учреждений и организаций, расположенных на территории избирательного округа.

Эффективность запроса во многом зависит от его содержания. В запросе следует кратко, но ясно изложить суть проблемы, указать мнение депутата о причинах допущенных недостатков и в чем заключается его требование.

Систематическое рассмотрение на сессиях запросов депутатов способствует дальнейшему развитию демократических принципов в деятельности представительных органов власти, усилению их роли в укреплении государственной и исполнительской дисциплины, позволяет расширять круг обсуждаемых местными Советами вопросов, повышать авторитет и активность депутатов, их ответственность перед избирателями.

**Александр ГРОСЮКОВ.**

**(Продолжение в следующем номере «МС»).**




Фота БЕЛТА.

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — САЦЫЯЛЬНЫМ ПЫТАННЯМ

**На сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў зацверджаны прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэт вобласці на 2007 год. Бюджэт захаваў сваю сацыяльную накіраванасць — на вырашэнне сацыяльных пытанняў запланавана выкарыстаць 2/3 яго расходнай часткі. У прыватнасці, фінансавыя ўкладанні ў ахову здароўя ў параўнанні з сёлетнім годам павялічацца амаль на 30 працэнтаў.**

Інвестыцыі ў асноўны капітал мяркуецца павялічыць на 17 працэнтаў. Пры гэтым не толькі прадоўжыцца тэхнічнае пераўзбраенне вядучых прамысловых прадпрыемстваў рэгіёна, але і пачнуцца работы па стварэнню новых вытворчасцяў — піваварнага завода ў Гродне, цагельнага — у Зэльве, парафініраваных паліўных брыкетаў — у Астраўцы, перапрацоўкі морапрадуктаў — у Іўі.

У сельскай гаспадарцы інвестыцыйныя рэсурсы будуць накіраваны на развіццё аграгарадкоў, стварэнне высокаэфектыўных і экалагічна чыстых тэхналогій вытворчасці прадуктаў харчавання, рэканструкцыю і аснашчэнне сучасным абсталяваннем комплексаў па гадоўлі буйной рагатай жывёлы і свіней, птушкафабрык, буйных малочнатаварных фермаў, абнаўленне парка сельскагаспадарчай тэхнікі.

Асаблівая ўвага будзе надавацца будаўніцтву жылля ў сельскагаспадарчых арганізацыях. У наступным годзе там запланаваны ўвод 1060 дамоў плошчай 76 тысяч квадратных метраў. Для вырашэння гэтай і іншых задач у будаўніцтве прадугледжана значна абнавіць парк асноўных машын, механізмаў і тэхналагічнай аснасткі — вежавых кранаў, аўтакранаў, экскаватараў, бульдозераў, асфальтаўкладчыкаў.

Рост інвестыцый будзе забяспечаны, у асноўным, за кошт уласных сродкаў арганізацый і крэдытных рэсурсаў банкаў. Плануецца актывізаваць і работу па прыцягненню замежных інвестыцый у свабодную эканамічную зону «Гроднаінвест» — мяркуецца, што яны ў 2007 годзе складуць больш за 6 мільёнаў долараў ЗША.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# УСЕ НА «ДЫСТАНЦЫІ»

**Агітацыйная кампанія ідзе спакойна і па плану, заявілі ў Магілёўскай абласной выбарчай камісіі. Сустрэчы кандыдатаў у дэпутаты з выбаршчыкамі адбываюцца паводле графікаў. Для агітацыі кандыдаты карыстаюцца мясцовым радыёвяшчаннем, і ў гэтым яны маюць роўныя ўмовы. Заўваг і скаргаў на недобрасумленную агітацыю, на парушэнні ў ходзе агітацыйнай кампаніі ў абласную камісію па выбарах не паступала. І на гэты момант пакуль ніхто з зарэгістраваных кандыдатаў не сышоў з «дыстанцыі»: усе на месцы і вядуць агітацыю.**

У Магілёўскай вобласці трэба абраць 3223 дэпутаты ў мясцовыя Саветы ўсіх узроўняў. На дэпутацкія мандаты сёння прэтэндуюць 3361 кандыдат. У большасці акруг выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў будуць безальтэрнатыўныя: там зарэгістраваны і агітуюць за свае праграмы толькі па аднаму кандыдату ў дэпутаты. Напрыклад, у Магілёве, дзе адна з самых вялікіх канкурэнцый на гэтых выбарах, на дэпутацкія месцы ў гарадскім Савеце прэтэндуюць 62 кандыдаты. Аднак у 19 акругах выбары будуць безальтэрнатыўнымі. Затое ў 4-х акругах давядзецца выбіраць з 3 кандыдатаў у дэпутаты.

9 студзеня пачалося датэрміновае галасаванне. Загадзя была праверана гатоўнасць усіх выбарчых участкаў. Прычыну, па якой выбаршчык хоча прагаласаваць датэрмінова, даводзіць да ведама камісіі неабавязкова: трэба толькі заявіць аб сваім намеры і прад'явіць дакумент, які пацвярджае асобу. Новая рэдакцыя Выбарчага кодэкса значна аблегчыла гэты працэс: цяпер можна прад'явіць не толькі пашпарт, але пенсійнае і службовае пасведчанні, студэнцкі білет і нават даведку, якая выдадзена органамі ўнутраных спраў. Выбарчыя ўчасткі працуюць на датэрміновым галасаванні з 10 да 14 і з 15 да 19 гадзін.

Паводле слоў намесніка старшыні Магілёўскага абласнога выбаркама Уладзіміра Беланогава, ва ўсе апошнія выбарчыя кампаніі колькасць прагаласаваўшых датэрмінова была прыкладна аднолькавай: ад 20 да 30 працэнтаў. Такі ж вынік чакаецца і цяпер.

У сувязі з выбарамі да жыхароў Магілёўскай вобласці, якія маюць права голасу, звярнуўся Каардынацыйны Савет грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, прафсаюзных і дзяржаўных арганізацый рэгіёна. Удзельнікі Савета заклікалі ўсіх выканаць свой грамадзянскі абавязак і ўзяць удзел у выбарах, таму што іх вынікі «ў значнай ступені будуць уплываць на далейшыя працэсы грамадска-палітычнай і сацыяльнай абстаноўкі ў нашай краіне». Каардынацыйны Савет таксама заклікаў выбаршчыкаў «аддаць свае галасы за кандыдатаў, праграмныя заявы якіх утрымліваюць канструктыўныя намеры па рэальнаму ўвасабленню ў жыццё надзённых інтарэсаў насельніцтва, якія спрыяюць на практыцы здзяйсненню справядлівай сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы!».

**Алена КАЗЛОВА.**

# А ПРАПАГАНДЫ МАЛАВАТА...

**У Брэсцкай гарадской выбарчай камісіі я застала адразу траіх яе прадстаўнікоў: старшыню Васіля Снітко, сакратара Таццяну Рубашэўскую і члена камісіі Яўгена Васіленка. Якраз вырашалася пытанне аб раздачы на ўчасткі для галасавання гатовых бюлетэняў. Васіль Іванавіч удакладніў з адпаведнымі службамі раённых адміністрацый шэраг арганізацыйных момантаў з тым, каб кожная ўчастковая камісія ў вызначаны час атрымала свой пакет дакументаў.**

Васіль Снітко амаль два дзесяткі гадоў займаецца выбарамі дэпутатаў усіх узроўняў. Апошнія тры кампаніі выступае ў якасці старшыні гарадской камісіі. На погляд вопытнага ў гэтай справе чалавека, гэта выбарчая кампанія праходзіць пакуль спакойна і роўна. Ніводнай сур'ёзнай скаргі ад удзельнікаў выбараў у гарадскі Савет пакуль не паступала ў абласныя ці рэспубліканскія органы.

Бываюць нейкія арганізацыйныя або іншыя накладкі, але яны вырашаюцца, так бы мовіць, у рабочым парадку. Як расказаў карэспандэнту «МС» Васіль Снітко, ва ўсіх акругах практычна закончана ўдакладненне спісаў выбаршчыкаў. Права на ўдзел у выбарах маюць каля 215 тысяч жыхароў горада над Бугам. Ужо амаль усе з іх атрымалі запрашэнне прыйсці на галасаванне з указаннем іх выбарчага ўчастка і часу работы камісій. На папярэдняй вучобе старшынь і членаў участковых камісій асаблівы ўпор быў зроблены на строгае захаванне закона, на работу згодна з літарай Выбарчага кодэкса.

Сакратар гарадской камісіі Таццяна Рубашэўская адзначыла, што самы працаёмкі папяровы этап работы скончаны. Таццяна Ціханаўна вельмі ўдзячна калегам Яўгеніі Топчай, Яўгену Еліну, Ганне Пановай, якія падышлі да свайго грамадскага абавязку надзвычай адказна. Актыўна працавалі і усе астатнія члены камісіі, калі трэба было рэгістраваць ініцыятыўныя групы, прымаць і правяраць подпісы, дэкларацыі. Зараз у сакратарыяце камісіі выдаюць апошнія пасведчанні даверaным асобам кандыдатаў, удакладняюць час выступлення па мясцовым радыё. На здзіўленне, да магчымасці выступіць перад вялікай аудыторыяй слухачоў кандыдаты ставяцца па-рознаму. Адны гатовы былі б хоць кожны дзень з'яўляцца ў эфіры, іншыя, наадварот, у прызначаны час на студыях наогул не з'яўляюцца. Ды і ўся агітацыйная работа, на думку Таццяны Ціханаўны, магла б весціся больш актыўна. Некаторыя кандыдаты не вельмі ахвотна праводзяць і сустрэчы з выбаршчыкамі.

Хоць ёсць прыклады і іншага кшталту. Асобныя кандыдаты пішуць заявы ў гарадскую камісію з просьбай, амаль з патрабаваннем арганізаваць ім сустрэчу з выбаршчыкамі ў пэўны час у вызначаным месцы. Даводзіцца ім цярпліва тлумачыць, што пра падобныя сустрэчы трэба дбаць самім кандыдатам разам з даверанымі асобамі.

Як адзначаюць старшыні і члены выбарчых камісій, з якімі давялося пагаварыць, прапаганды адказнай палітычнай кампаніі наогул малавата. Бывае, уручаеш людзям запрашэнні, а яны дакладна не ведаюць, калі тыя выбары і каго трэба выбіраць. Адчуваецца і недахоп сродкаў. Так, на добраўпарадкаванне ўчасткаў для галасавання выдзелена толькі па 20 тысяч рублёў. Але ж, як філасофскі зазначыў старшыня выбарчай камісіі № 1 Брэста Рамуальд Жабінскі, грошай заўсёды на ўсё не хапае, а выбары праводзіць трэба. На ўчастку, паводле слоў Рамуальда Адольфавіча, усё гатова. Складзены графік дзяжурстваў членаў камісіі, каб у кожны з дзён да нядзелі кожны жадаючы мог прагаласаваць датэрмінова, а таксама рэалізаваць сваё права ў дзень выбараў. Атрымала ўчастковая камісія інструкцыі таксама наконт работы з назіральнікамі. Апошнія могуць назіраць за выбарамі пасля таго, як будуць зарэгістраваныя ў спецыяльным журнале пасля прад'яўлення дакументаў аб іх паўнамоцтвах. Дарэчы, у той самы журнал будуць занесены прозвішчы прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, якія пажадаюць асвятляць выбарчы працэс.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# АДНЫХ РЭГІСТРУЮЦЬ, ІНШЫЯ СЫХОДЗЯЦЬ

**На Віцебшчыне, паводле слоў старшыні Віцебскай абласной выбарчай камісіі па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў Міхаіла Пішчулёнка, бягучы выбарчы працэс праходзіць спакойна і ў рамках заканадаўства. Пры гэтым можна адзначыць параўнальна большую актыўнасць удзельнікаў, чым падчас мінулых выбараў у мясцовыя Саветы.**

Міхаіл Уладзіміравіч тлумачыць гэта ўзросшай свядомасцю грамадзян, якія за апошні час атрымалі добры выбарчы вопыт: раней выбіралі парламентарыяў, потым галасавалі на рэферэндуме, выбіралі Прэзідэнта Беларусі... У прыватнасці, у абласную выбарчую камісію па самых розных пытаннях падчас бягучай выбарчай кампаніі былі накіраваны для разгляду больш за 30 зваротаў, а падчас выбараў у мясцовыя Саветы 24-га склікання — каля 25.

Па выніках разгляду абласной выбарчай камісіі скаргаў на адказ у рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты Віцебскага абласнога Савета былі зарэгістраваны два прэтэндэнты на дэпутацкія мандаты: па Садовай выбарчай акрузе № 47 і Смаленскай № 49. Кожны з іх нарадзіўся ў 1941 годзе, з'яўляецца беспартыйным, пенсіянерам. Іншы кандыдат на дэпутацтва ў абласным Савеце па сваёй волі сышоў з выбарчай дыстанцыі. У выніку, паводле даных на 5 студзеня, у абласны Савет балатаваліся 78 кандыдатаў, а ўсяго ў гэты орган мясцовага самакіравання трэба выбраць толькі 60 прадстаўнікоў народа. Такім чынам у любы момант могуць зняць свае кандыдатуры прэтэндэнты ў Саветы іншых узроўняў...

Віцебская гарадская выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі 44 прэтэндэнтам. Да 1 студзеня больш чым 10 з іх звярнуліся ў суд, каб іх усё ж зарэгістравалі ў якасці кандыдатаў. У выніку ім было ў гэтым адмоўлена.

Усяго, як расказаў нашаму карэспандэнту Міхаіл Пішчулёнак, па стану на раніцу 5 студзеня, на 3658 дэпутацкіх мандатаў у органы мясцовага самакіравання Віцебшчыны прэтэндуюць 3839 кандыдатаў. Сярод кандыдатаў больш за 40 працэнтаў — жанчыны, больш за 6 працэнтаў — прадстаўнікі моладзі, каля паловы раней ужо выбіраліся ў мясцовыя Саветы.

Усяго ў Віцебскай вобласці трэба сфарміраваць 241 мясцовы Савет: 1 абласны, 21 раённы, 4 і 3 гарадскіх — у гарадах абласнога і раённага падпарадкавання адпаведна, 12 пасялковых і 200 сельскіх Саветаў.

У апошніх, дарэчы, за дэпутацкія мандаты практычна змагаюцца толькі па аднаму кандыдату. Так што фактычна выбары будуць безальтэрнатыўнымі. І арганізатары спадзяюцца, што кандыдаты будуць дастойныя галасоў выбаршчыкаў. Канкурэнцыя назіраецца ў малых і вялікіх гарадах: у некаторых з іх змагаюцца за перамогу ў выбарах па два і больш кандыдатаў... Ад палітычных партый усяго ў вобласці балатуюцца каля 1 працэнта ад колькасці ўсіх кандыдатаў. Лідар па колькасці зарэгістраваных — КПБ. Адпаведна большасць кандыдатаў вылучылі ў працоўных калектывах і шляхам збору подпісаў грамадзян.

У напружанай штодзённай рабоце па падрыхтоўцы да правядзення выбараў удзельнічаюць больш за 11 тысяч членаў выбарчых камісій. А галасаваць на ўчастках маюць права больш за 900 тысяч выбаршчыкаў — жыхароў Віцебшчыны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# БЕЗ АСАБЛІВАГА АЖЫЯТАЖУ

**Перадвыбарная агітацыя на Гомельшчыне носіць спакойны, а можа нават залішне спакойны характар, заявіў на прэс-канферэнцыі намеснік старшыні абласной камісіі па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў 25-га склікання Аляксандр Усаў. Напрыклад, некаторыя кандыдаты ў дэпутаты адмовіліся ад выступленняў па радыё, не назіраецца асаблівага ажыятажу вакол прамых сустрэч з грамадзянамі, хоць усе заяўкі прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат на правядзенне падобных масавых мерапрыемстваў як у клубах, так і палацах культуры улады задавальняюць. Апрача, хіба, асобных выпадкаў, калі некалькі кандыдатаў настойвалі на тым, каб наладзіць такія сустрэчы з выбаршчыкамі... на цэнтральнай плошчы Гомеля, дзе была ўстаноўлена галоўная ёлка і арганізаваны навагоднія атракцыёны.**

Наогул жа ў вобласці ў мясцовыя Саветы ўсіх узроўняў быў зарэгістраваны 4481 кандыдат з улікам таго, што 120 з іх не прайшлі «чыстку» ў камісіях. 20 з апошніх звярнуліся ў абласную камісію са скаргамі, што іх быццам бы «адсеялі» ў «канкурэнтнай барацьбе» без падстаў. Шасцёра з тых дваццаці прэтэндэнтаў спазніліся з тэрмінамі падач скаргаў, а што датычыцца астатніх чатырнаццаці, дык абласная камісія пацвердзіла правільнасць вывадаў ранейшых камісій (парушэнні былі дапушчаны прэтэндэнтамі пры запаўненні дэкларацый аб даходах ці ў падпісных лістах). Трое з гэтых чатырнаццаці паспрабавалі адстаяць свае правы ў абласным судзе, аднак і там было ўстаноўлена, што яны не маюць рацыі, бо ўказаныя парушэнні сапраўды мелі месца.

Трэба сказаць, што і пасля рэгістрацыі з перадвыбарнай «гонкі» былі зняты восем кандыдатаў у дэпутаты (тры — у абласны, чатыры — у Гомельскі гарадскі і адзін — у раённы Саветы). Не, парушэнняў ніхто з іх не зрабіў, а рашэнне такое яны прынялі па сваёй волі. У выніку ўзніклі пэўныя праблемы: прозвішчы кандыдатаў ужо былі пазначаны ў аддрукаваных бюлетэнях, і цяпер участковым камісіям трэба ўносіць у іх адпаведныя карэктывы, што, вядома ж, ускладняе работу.

Дарэчы, як падкрэсліў Аляксандр Усаў, кожны кандыдат у дэпутаты можа зняць сваю кандыдатуру нават за дзень да выбараў, бо такое права яму дае закон. Але калі тэрытарыяльная камісія прыйдзе да высновы, што гэта зроблена ім без уважлівай прычыны, яны могуць прад'явіць рахунак на кампенсацыю расходаў, якія пайшлі на яго перадвыбарную кампанію.

І яшчэ. Падлічана, што ў сярэднім на кожнага кандыдата ў дэпутаты на сёлетніх выбарах давядзецца затраціць 370 тысяч рублёў, а на ўсю выбарчую кампанію ў вобласці — звыш аднаго мільярда шасцісот мільёнаў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

ПРАГРАМА ПАДТРЫМКІ

# БЮДЖЭТ ВЫЗНАЧАЮЦЬ... «БАЛЮЧЫЯ КРОПКІ»?



**Рэгулярныя абследаванні ўмоў жыцця і падтрымка, якая аказваецца ветэранам вайны і адзінокім пенсіянерам, вядуць да паступовага зніжэння колькасці просьбаў і хадайніцтваў аб аказанні той ці іншай дапамогі. Такім аказаўся вынік праверкі работы з гэтымі катэгорыямі грамадзян, што была праведзена напрыканцы мінулага года ва ўсіх абласцях і сталіцы нашай краіны.**

Паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, па стану на 1 кастрычніка мінулага года ў Беларусі налічвалася 70,3 тыс. ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, 12 623 члены сем'яў грамадзян, што загінулі падчас Вялікай Айчыннай, у Афганістане ці пры выкананні воінскай службы ў мірны час, 149,2 тыс. адзінокіх пенсіянераў, а таксама 593,9 тыс. пенсіянераў, якія пражываюць асобна ад працаздольных дзяцей і іншых сваякоў.

— Калі раней дапамога гэтым катэгорыям грамадзян звычайна аказвалася на падставе заяў, то апошнім часам на першае месца выйшаў так званы «выяўны» прынцып, — адзначае начальнік аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей міністэрства Іван Нагібін. — Інакш кажучы, тут сталі практыкавацца наведванні на даму, работа тэлефонаў даверу і тэлефонаў тэрміновай дапамогі, а гэта дало магчымасць выслухаць просьбы і пажаданні кожнага чалавека, і адпаведна, распрацоўваць канкрэтныя праграмы падтрымкі.

Пры гэтым адметна, што падобныя абследаванні ўмоў жыцця праводзяцца ва ўсіх населеных пунктах без выключэння, і ў тым ліку — у аддаленых і малаколькасных вёсках.

Як паказала праверка, з боку ветэранаў вайны і адзінокіх пенсіянераў не ўзнікала ніякіх заўваг наконт выплаты і дастаўкі пенсій. Практычна тое ж можна сказаць і наконт прадастаўлення льгот. Пытанні ў асноўным датычыліся іншага — рамонту кватэр, дамоў, гаспадарчых пабудоў, агароджаў, печак, замены старой электраправодкі, а таксама дапамогі з апрацоўкай прысядзібных участкаў, нарыхтоўкай сена і кармоў, забеспячэннем палівам. Зрэшты, большасць падобных просьбаў удаецца вырашыць непасрэдна «на месцах». І не ў апошнюю чаргу — праз тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

— Сёння ў краіне працуе 156 падобных цэнтраў, прычым 118 з іх — у так званых «вясковых» раёнах, — працягвае Іван Нагібін. — Дзякуючы цэнтрам мы змаглі наблізіць дапамогу да месца жыхарства ўсіх тых, хто мае ў ёй патрэбу. Пры гэтым у будучым атрымліваць падтрымку грамадзянам, што пражываюць наводдаль райцэнтраў, стане прасцей. Так, пачалося стварэнне сацыяльных пунктаў або філіялаў тэрытарыяльных цэнтраў у аграгарадках. А даволі перспектыўны напрамак для аддаленых вёсак — арганізацыя сацыяльнага абслугоўвання на мабільнай аснове.

Ужо традыцыйна асаблівая ўвага — ветэранам вайны. Паводле вынікаў праверкі, у гэтых людзей няма вялікіх цяжкасцяў з забеспячэннем крэсламі-каляскамі і слыхавымі апаратамі, устаноўкай хатніх тэлефонаў, дапамогай па гаспадарцы і гандлёвым абслугоўваннем. За студзень—лістапад летась звыш 2 тысяч ветэранаў Вялікай Айчыннай атрымалі пуцёўкі на санаторна-курортнае лячэнне, а 47,5 тыс. чалавек — кампенсацыі за нявыкарыстаныя пуцёўкі. Да таго ж, штогод усе інваліды і ўдзельнікі вайны праходзяць абавязковыя агляды ўрачоў, каля 30 тысяч ветэранаў — стацыянарны курс лячэння ў спецыялізаваных шпіталях, апроч таго, у медыцынскіх установах для іх выдзелена 1615 палат павышанага камфорту. Нарэшце, у краіне дзейнічае 95 бальніц сястрынскага догляду. А ў выпадку жадання інвалідаў ці ўдзельнікаў вайны, якія не маюць увогуле ці жывуць асобна ад дзяцей і працаздольных сваякоў, перасяліцца ў дом-інтэрнат стала практыкай прадастаўляць неабходныя месцы ў першачарговым парадку.

Горшым аказалася становішча з жыллём. Ва ўсіх рэгіёнах прымаюцца меры па паляпшэнню жыллёвых умоў інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, інвалідаў і ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, а таксама членаў сем'яў загінулых. Да прыкладу, за студзень—лістапад мінулага года ўсім гэтым катэгорыям было выдадзена 264 кватэры. Аднак разам з тым даводзіцца канстатаваць — цяперашнія тэмпы будаўніцтва жылля, і перш-наперш сацыяльнага, застаюцца недастатковымі. Такім чынам, па стану на пачатак кастрычніка па краіне ў чарзе працягвала заставацца звыш 3,5 тыс. ветэранаў войнаў і членаў сем'яў загінулых. І прыкладна палова гэтай чаргі прыпадала на сталіцу.

— Нягледзячы на гэта, можна сцвярджаць, што ў цэлым практыка работы з ветэранамі вайны, якая пачалася падчас святкаванняў апошніх юбілеяў вызвалення Беларусі і Перамогі, захавалася, — зазначае Іван Нагібін. — І больш таго, яе ўдалося распаўсюдзіць на іншыя катэгорыі грамадзян — у першую чаргу на пенсіянераў, якія па тых ці іншых прычынах сёння жывуць адны.

Зразумела, што сацыяльная падтрымка — гэта заўсёды грошы. Прычым з розных крыніц. Летась з рэспубліканскага бюджэту ўдалося прафінансаваць выраб ільготных талонаў для праезду ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай і шэрагу іншых ільготнікаў па тэрыторыі краін СНД, набыццё камплектуючых, вытворчасць і рамонт пратэзаў для інвалідаў вайны. Аднак асноўная «нагрузка» прыйшлася на рэгіёны. Як правіла, сродкі на выкананне канкрэтных просьбаў «шукалі» менавіта тут.

— Варта падкрэсліць, што зараз усе рэгіёны маюць свае планы мерапрыемстваў і праграмы па падтрымцы ветэранаў і адзінокіх пажылых людзей, — зазначае Іван Нагібін. — Сам па сабе гэты факт прыемны. Праўда, адначасова камісія, што праводзіла праверку, лічыць, што надалей павінна дзейнічаць правіла — рабіць абследаванні ўмоў жыцця гэтых катэгорый яшчэ да пачатку разгляду мясцовых бюджэтаў. Бо не сакрэт, што гэта дазволіць больш дакладна планаваць сродкі — з улікам патрэбы кожнага чалавека.

**Сяргей ГРЫБ.**

# НЕ ДЗЕЛЯ ТУРЫСТАЎ...

## На тэрыторыі Квасоўскага сельсавета не толькі выдатна працуюць, але і шануюць сваю мінуўшчыну

**СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ вытворчы кааператыў «Свіслач», дзе старшынстве Васіль Мікалаевіч Густыр, даўно праславіўся на ўсю рэспубліку сваімі працоўнымі дасягненнямі. Здавалася б, тут ёсць усё — зайздросныя ўраджаі, эфектыўная эканоміка, і дастойныя сацыяльна-бытавыя ўмовы. Дык не, узяліся, як кажуць, усёй талакой за справу, якая не рэгламентуецца ніякімі планамі і прагнознымі паказчыкамі. На верхатуры палаца былой графіні Марты Красінскай, дзе цяпер размяшчаецца праўленне гаспадаркі, Дом культуры, бібліятэка і іншыя ўстановы, за некалькі дзён да Новага года быў адчынены музей СВК «Свіслач». Па сутнасці, гэта музей не толькі сельгаскааператыва, але і ўсіх населеных пунктаў тутэйшага сельсавета.**

— Гэта зроблена ў імя памяці пра нашых землякоў, якія пралівалі кроў на франтах Вялікай Айчыннай вайны (са ста чалавек больш за сорак не вярнуліся дамоў), з павагай да тых, хто працаваў у гаспадарцы і разам з намі, і раней. Дарэчы, у савецкі час саўгас «Свіслач» адзіны ў раёне быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Станіслаў Іванавіч Абужынскі і Марыя Віктараўна Занеўская сталі Героямі Сацыялістычнай Працы, чатыры чалавекі — кавалерамі ордэна Леніна, — гаворыць кіраўнік СВК Васіль Густыр. — Зрэшты, нашы мясціны славіліся яшчэ і з часоў графіні Красінскай. Тут былі прадпрыемствы па вытворчасці цэглы, ганчарных труб, чарапіцы, а тутэйшы конезавод штогод пастаўляў для польскага войска ажно каля 600 коней знакамітых парод.

— Чалавек, які не памятае мінулага, нічога добрага не пакіне будучым пакаленням, — лічыць старшыня Квасоўскага сельскага Савета Віктар Гідравец. — Ідэя ўзнікла даўно, і вось цяпер, пасля зробленага за грошы гаспадаркі капітальнага рамонту, яна ажыццявілася. Не дзеля турыстаў (хоць і ім мы рады), а для мясцовых жыхароў, найперш для моладзі, дзяцей. Каб яны ведалі пра свае карані, гісторыю малой Радзімы, шанавалі продкаў. А што датычыцца турыстычнага патэнцыялу, то ўжо сёння ёсць маршрут з Польшчы, які пралягае праз нашы мясціны і знакаміты палац, што захаваўся практычна ў першапачатковым выглядзе.

Ініцыятыву ўзяцца за збор музейнай экспазіцыі праявіла настаўніца мясцовай школы, а цяпер пенсіянерка Зінаіда Шыдлоўская. У пошуку матэрыялаў для музея яна абышла ўсе навакольныя вёскі, шмат папрацавала і ў гродзенскіх архівах. Там Зінаіда Лявонцьеўна найперш пацікавілася гісторыяй палаца Красінскай і ўвогуле яе роду. Чым яны займаліся, чым захапляліся? Аказваецца, іх гаспадарчы талент праявіўся не толькі ў вышэйпамянёных вытворчасцях і выдатным конезаводзе. Вандаліну Буслоўскаму, а потым і яго дачцэ Марце Красінскай належала першае месца ў Гродзенскай губерні па вытворчасці воўны танкарунных авечак. Цікава, што ўзоры воўны былі прыклеены да дзелавых папер і па сённяшні дзень знаходзяцца ў архіве.

Зінаіда Шыдлоўская (дарэчы, у школе яна выкладала хімію і біялогію, але заўсёды цікавілася гісторыяй тутэйшых мясцін) зацікавілася і часам утварэння населенага пункта Свіслач. Раней вядомыя пісьмовыя крыніцы ўказвалі на 1750 год, аднак Зінаіда Лявонцьеўна натрапіла на архіўныя матэрыялы, паводле якіх ён быў вядомы яшчэ ў 1558 годзе. Такім чынам, з'явіліся падставы для святкавання ў наступным годзе 450-гадовага юбілею.

Самаробны драўляны ложак, падвешаная да столі люлька, у якой калісьці калыхалі дзіця, калаўрот, ткацкі станок, куфары і куфэркі, драўляныя карыта, плецены саламяныя кашы для захоўвання збожжа і мукі, жорны, якімі хоць сёння карыстайся для памолу зерня... Усё гэта, не чужое, а сваё, спрадвечнае, дае ўяўленне аб тым, як жылі нашы дзяды і прадзеды.

На развітанне знаёмімся з яшчэ адной залай, якую назвалі «Сучаснае і будучае». Яна, зрэшты, як і іншыя музейныя раздзелы, чакае новых экспанатаў. І яны, можна не сумнявацца, паступяць. У Зінаіды Шыдлоўскай ужо цяпер маецца шмат яшчэ не падрыхтаваных для экспазіцыі архіўных звестак, а некаторыя вяскоўцы, пабываўшы на адкрыцці музея, паабяцалі дастаць са сваіх гарышчаў і прынесці сюды рэдкія і нават дзіўныя для сённяшняга часу рэчы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК,**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**



МЯСЦОВЫ ЧАС

# ДЗВЕ СЯСТРЫ

**САЛЯНЦІНА ДРАЧОВА і Надзея Урбан — сёстры. Валянціна Аляксееўна працуе старшынёй Любоніцкага сельскага Савета, што ў Кіраўскім раёне, Надзея Аляксееўна — ляснічым Любоніцкага лясніцтва Бабруйскага лясгаса. Працаўнікі вёскі вылучылі іх абедзвюх кандыдатамі ў дэпутаты Кіраўскага раённага Савета. Чаму?**

Нават у гэтыя пахмурныя зімовыя дні вёска Любонічы выглядае па-святочнаму. Дабротныя, пафарбаваныя ў светлы колер дамы на Цэнтральнай вуліцы, адмысловая, з густам зробленая агароджа радуюць вока... Паралельна з Цэнтральнай вуліцай праходзіць Школьная — з белымі катэджамі, дзе працаўнікі вёскі атрымалі 50 кватэр з усімі выгодамі. Забудоўваецца вуліца Маладзёжная, на якой за апошнія гады ўзведзена сем камфартабельных дамоў.

Асабліва арыгінальна, нават экзатычна выглядае ў Любонічах вуліца Полюсная — амаль на тры кіламетры працягнулася яна з поўначы на поўдзень. Шырыня вуліцы больш за 200 метраў, пасярэдзіне працякае і невялікі ручаёк — рэчышча былой рэчкі — у атачэнні вербаў і бяроз... Усюды чысціня, парадак, прыгажосць, адчуваецца дбайная гаспадарская рука. А пачынаць жа старшыні Савета даводзілася з самага элементарнага. Колькі сіл і намаганняў пайшло на тое, каб, напрыклад, прывучыць людзей вывозіць смецце на звалку, а не скідваць за вёскай дзе папала.

Сёння Любонічы адпавядаюць дзяржаўнаму стандарту аграгарадка. Тут маецца разгалінаваная сацыяльная інфраструктура: сярэдняя школа, трохпавярховы прасторны Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы садок, урачэбная амбулаторыя, бальніца сястрынскага догляду, аптэка, аддзяленне сувязі, гандлёвы цэнтр, кафэ, комплексны прыёмны пункт.

У склад Любоніцкага сельсавета ўваходзіць восем вёсак, і ўсе яны размешчаны, лічы, кампактна, у радыусе 2—7 км. Самая аддаленая толькі адна — Ігнацоўка. Знаходзіцца яна за 10 км ад цэнтра, пасярод лесу, за рэчкай Ольса. Стаіць там тры хаты, жыве пяць чалавек. Але і яны не засталіся без увагі і клопату. На хутарок правялі электрычнасць. Летась працягнулі туды кабель, паставілі ў хаце Анастасіі Фёдараўны Кулік тэлефон — ёсць сувязь са светам. Там жа арганізавалі Дом сацыяльных паслуг. Раз на месяц прыязджаюць урач, прадстаўнік сацыяльнай службы, цырульнік. Двойчы на тыдзень — наведвае аўталаўка.

— Спакойная я і за вёску Кострычы, — гаворыць старшыня сельскага Савета, — там удалося захаваць ФАП, працуе ў ім выдатны спецыяліст, сумленны і добры чалавек — Валянціна Фёдараўна Краўчанка. Яна для жыхароў і хатні доктар, і сястра міласэрнасці, і мудры дарадца. Пашанцавала вёсцы на добрага медработніка, а для пажылых людзей гэта вельмі важна.

Дарэчы, у бальніцы сястрынскага догляду, якой загадвае Ірына Рыгораўна Бодак, жыве дваццаць чалавек. Састарэлыя, нямоглыя людзі знайшлі тут цяпло, утульнасць, абарону ад жыццёвых нягод... Старшыня Савета пастаянна наведвае бальніцу, цікавіцца бытам, дапамагае, калі ёсць патрэба. Увогуле Валянціна Аляксееўна — кіраўнік, як кажуць, даступны і чулы. Да яе смела ідуць па параду і дапамогу і маладыя, і пенсіянеры...

— Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» даў магчымасць сельскім Саветам самастойна і больш эфектыўна вырашаць многія пытанні. Людзі сталі радзей звяртацца ў раённыя і вышэйшыя інстанцыі, — гаворыць Валянціна Аляксееўна. — Іх клопатамі і праблемамі мы займаемся тут, на месцы.

* * *

Любоніцкае лясніцтва ўваходзіць у склад Бабруйскага лясгаса, займае плошчу больш як дзесяць тысяч гектараў. Узначальвае яго Надзея Урбан. Працоўны калектыў лясніцтва — мужчынскі.

— Работа наша складаная, але цікавая, творчая, — разважае Надзея Аляксееўна, — бо справу маем з жывым, зменлівым арганізмам — лесам. Яму, як і чалавеку, патрэбны падтрымка, дапамога і догляд. Дровамі, дарэчы, лясніцтва забяспечвае насельніцтва Любоніцкага, Казуліцкага, Мышкавіцкага сельсаветаў, часткова горада Кіраўска. Штогод праводзяцца лесапасадкі на месцах планавых лесасек. Пашыраем лясныя плошчы і за кошт нізкабальных зямель, якія калгасы перадаюць лясніцтву. У мінулым годзе перададзена 275 гектараў такіх зямель, 71 гектар з іх ужо засаджаны лесам.

Значную дапамогу ў пасадцы дрэў, зборы насення, ачыстцы лесу і яго ахове аказваюць члены школьнага лясніцтва Любоніцкай СШ. Школьнае лясніцтва — добрая форма экалагічнага і працоўнага выхавання навучэнцаў. Любіць і берагчы прыроду — гэта значыць любіць Радзіму, свой край. У гэтым упэўнена Надзея Аляксееўна УРБАН.

Увогуле Валянціну і Надзею яднаюць не толькі кіраўнічыя пасады. Пасада — гэта адзнака за твае чалавечыя, дзелавыя якасці: адказнасць, сумленнасць, працавітасць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу... Магчыма, гэта і дробязная дэталь, але дамы і падворкі сясцёр з'яўляюцца ледзь ці не самымі ўзорнымі ў вёсцы.

**Міхаіл АЛЕЙНІКАЎ,**
*Кіраўскі раён.*

# «ВІЦЕБСКІЯ КАЛЯДЫ» Ў «ЗАДЗВІННІ»

У віцебскім цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінне», што працуе ў гістарычнай забудове на беразе Заходняй Дзвіны, адсвяткавалі Каляды. Гараджане з дзецьмі, сваякамі, знаёмымі сабраліся ў гэтым утульным куточку абласнога цэнтра, каб узяць удзел у святкаванні. Артысты з самадзейных калектываў калядавалі, спявалі, танцавалі... І прыемна было чуць родную беларускую мову. А Дзед Мароз і Снягурка раздалі салодкія падарункі ўсім без выключэння маленькім гасцям свята, арганізавалі святочны круг, у якім «закруціліся» дзятва і дарослыя.

**Калядаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



# БОЛЬШ АДДЗЯЛЕННЯЎ — БОЛЬШ ПАСЛУГ

Далейшае развіццё сеткі сацыяльных устаноў пойдзе шляхам адкрыцця сацыяльных пунктаў ці філіялаў цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання ў аграгарадках, малых і сярэдніх гарадах Беларусі, што дазволіць вызначыць аптымальны радыус прадастаўлення паслуг сельскім жыхарам, і асабліва тым з іх, хто пражывае ў аддаленых і малакалькасных вёсках — аб гэтым паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Надзея Басюк.

Калі раней большасць тэрытарыяльных цэнтраў звычайна займалася толькі зборам інфармацыі аб «праблемных» катэгорыях насельніцтва ў раёнах, а таксама аказаннем сацыяльных паслуг на даму, то зараз пералік паслуг стаў нашмат большым. У прыватнасці, пры цэнтрах з'яўляецца ўсё больш аддзяленняў тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання для аказання паслуг аднаразовага характару і матэрыяльнай дапамогі ў «экстранных» выпадках, аддзяленняў псіхалагічнай дапамогі і рэабілітацыі, аддзяленняў дзённага знаходжання для дзяцей-інвалідаў і аддзяленняў кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, у якіх гэтым катэгорыям грамадзян прадастаўляецца магчымасць пажыць да 6 месяцаў, атрымаць догляд і харчаванне. Дарэчы, адзначыла Надзея Басюк, зараз у сярэднім на кожны цэнтр прыпадае па пяць асобных аддзяленняў. Іх «профілі» рэгіёны вызначаюць самастойна — з улікам уласнай патрэбы.

Між тым, яшчэ адным адметным момантам стаў пераход тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ад заяўнай на «выяўную» работу па прынцыпу «аднаго акна». Так, заўважыла Надзея Басюк, летась спецыялістамі цэнтраў былі абследаваны ўмовы жыцця 148 тысяч адзінокіх пажылых грамадзян нашай краіны, прычым, як высветлілася, амаль дзве трэці з іх мелі патрэбу ў той ці іншай дзяржаўнай падтрымцы. Прычым у цэлым банк даных тэрытарыяльных цэнтраў зараз складае ўжо больш за 1,4 мільёна чалавек — апроч адзінокіх пенсіянераў, у яго ўваходзяць пажылыя асобы, што жывуць асобна ад дзяцей і іншых працаздольных сваякоў, інваліды, шматдзетныя, няпоўныя і няўдалыя сем'і, выпускнікі дамоў-інтэрнатаў, а таксама асобы, што вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі.

**Сяргей ГРЫБ.**

# ДЗЯКУЙ, АДАМАЎНА,

## або Грамадскі выхавальнік па-Парахонску

**У Парахонскім сельсавеце, што ў Пінскім раёне, ад вёскі Беразцы да Парахонска — 23 кіламетры. Таму даўно стала прывычным для ўсіх бачыць старшыню Савета Ганну Жук за рулём. З транспартам Ганна Адамаўна адчувае сябе мабільнай. Аб'едзе з ранку вёскі, наведае адзінокіх, старых, нямоглых, і так званыя праблемныя сем'і не абміне.**

Пра гэтыя цяжкія, праблемныя, неўладкаваныя сем'і мы і гутарым з кіраўніком мясцовай улады. Справа ў тым, што Парахонск — вёска з асаблівай гісторыяй. Невялікае некалі мястэчка пасярод непраходных балот з ажыццяўленнем меліярацыі Палесся стала сучасным пасёлкам з буйным жывёлагадоўчым комплексам. У 80-я гады тут пабудавалі жыллё, інфраструктуру. Жыхары нават не без гонару ўспамінаюць, як іх вёску наведаў тагачасны сакратар ЦК КПСС па сельскай гаспадарцы Міхаіл Гарбачоў. З будаўніцтвам жылля Парахонск прыняў многа прыезджых людзей. Ганна Адамаўна пералічвае, прадстаўнікі якіх нацыянальнасцяў жывуць у сельсавеце — і пальцаў адной рукі не хапае. Але нацыянальных праблем тут зроду не было. Ёсць іншыя — калі асобныя вяскоўцы залішне захапляюцца гарэлкай. А цяпер з'явілася яшчэ адна тэндэнцыя, што не паляпшае маральна-псіхалагічную абстаноўку. Некаторыя асобы пэўных паводзінаў прадаюць жыллё ў Пінску і набываюць таннейшыя кватэры тут, такім чынам папаўняюць лік праблемных сем'яў.

Ёсць яшчэ адна катэгорыя гаротных грамадзян, на якіх рэдка хто звяртае ўвагу ў звычайным жыцці, а старшыня Жук не змагла прайсці міма. У вёсцы жывуць адзінокія мужчыны, ад якіх адракліся сем'і, бо гаспадары ў свой час страцілі працу, спіліся і пакаціліся на дно жыцця. Іх Савет змог неяк згуртаваць і прыцягнуць да работы па добраўпарадкаванню населенага пункта. Праз раённы цэнтр занятасці гэтых людзей афармляюць на часовую працу. Апошнім часам сфарміраванае такім чынам будаўнічае звяно ставіла агароджу ўздоўж вуліц. За адзін месяц рабочыя атрымалі па 400 тысяч рублёў зарплаты. Як толькі грошы прывезлі з раёна, Ганна Адамаўна адразу ж сабрала сваіх «ударнікаў» і павяла на рынак, дзе і набылі кожнаму курткі, кашулі, штаны, зімовы абутак. Такім чынам заробленае пайшло на карысць. Які-небудзь артадаксальны праваабаронца, можа, і знайшоў бы ў дзеяннях старшыні сельскага Савета крымінал. Толькі мужыкі тыя, калі пахаладала, казалі: «Дзякуй, Адамаўна».

Не пакінула Ганна Адамаўна сам-насам з бядой і дваіх дзяцей маці-адзіночкі, выпускніцы школы-інтэрната. Жанчыне як сацыяльнай сіраце далі кватэру, уладкавалі на работу. Усе ўмовы былі, каб будаваць жыццё не так, як у свой час зрабіла яе маці. Але маладзіца нават не ведала, як весці хатнюю гаспадарку, не магла размеркаваць грошы на сямейныя патрэбы. Раз, другі нешта з задуманага не атрымалася — і запіла. Тады да няўдачлівай гаспадыні зачасціла стараста вёскі Ганна Раманаўна Ярашэвіч. Сталая кабета пачала вучыць дарослую жанчыну азам хатняй гаспадаркі. Атрымала зарплату, дапамогу на дзяцей, селі разам з Ганнай Раманаўнай і распісалі на лісце паперы, колькі грошай трэба на муку, крупы, макароны, алей, колькі — на камунальныя плацяжы і неабходныя для дзяцей рэчы і школьныя прыналежнасці з тым, каб хапіла на малако і хлеб кожны дзень. І так пакрысе, памалу навaспечаная жыхарка Парахонска спасцігала навуку паўсядзённага жыцця. А калі праз колькі тыдняў справы пайшлі на лад, у доме з'явіўся хлеб, іншыя прадукты, дзеці перасталі саромецца, іх маці зразумела, што побыт можна ўладкаваць і пры невялікіх даходах. Было б толькі жаданне.

Такіх грамадскіх выхавальнікаў старшыня сельскага Савета і ўчастковы інспектар Віктар Аксютчык замацоўваюць за многімі праблемнымі сем'ямі. Здараецца, дапамагае. Як было і ў выпадку з маці дваіх дзяцей. Узялася жанчына за розум, працуе дворнікам, на чарку больш не заглядваецца, як раней, навучылася і гаспадарку весці, даходы-расходы падлічваць. І цяпер ёй такое падрабязнае шэфства ўжо не патрэбна.

Затое патрэбна іншым. На тэрыторыі сельсавета жыве пяць сем'яў, якія, паводле слоў Ганны Жук, на асаблівым кантролі. Дзве з іх вельмі падобныя лёсамі. Па трое дзяцей, мужы моцна выпівалі, памерлі. Засталіся адны маці, якія мала адстаюць ад мужоў у схільнасці да гарэлкі. Такім чынам, дзеці гадуюцца ў надзвычай складаных умовах. З сем'ямі працуе школьны сацыяльны педагог, дырэктар школы, участковы інспектар. Пакуль што агульныя намаганні не прывялі да карэнных зрухаў у свядомасці жанчын-маці. Але старшыня Савета ўсё ж не страчвае надзею, што сем'і ўдасца ўратаваць, а дзяцей не давядзецца афармляць у інтэрнаты.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Пінскі раён.*

ДОБРАЯ НАВІНА

# ЁСЦЬ ДЗЕ ВУЧЫЦЦА РАЗУМНАМУ І ВЕЧНАМУ

**8 студзеня ў раённым цэнтры Клічаў Магілёўскай вобласці адкрылася новая школа. Сярэдняя школа № 1, у якой вучыцца больш за 700 дзяцей, атрымала новы сучасны будынак.**

Яго будаўніцтва вялося яшчэ з 1996 года, але было замарожана. І толькі апошнім часам работы аднавіліся. Увогуле на будаўніцтва новай школы было выдаткавана больш за 20 мільярдаў рублёў з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў.

Стары двухпавярховы будынак школы даўно патрабаваў капітальнага рамонту, там нават прыбіральня была на вуліцы. Дзеці вучыліся ў дзве змены, кабінетаў не хапала, (цяпер жа — толькі ў адну). Новая школа пабудавана па сур'ёзнаму праекту, яна вялікая і прасторная. У ёй, толькі ўявіце сабе, тры спартыўныя залы: для малодшых школьнікаў, гімнастычная і для гульнявых відаў спорту. Ёсць у школе і два сучасныя камп'ютарныя класы.

На ўрачыстым адкрыцці новага будынка школы № 1 дзеці, іх бацькі і настаўнікі ў адзін голас гаварылі, як патрэбна была новая школа раённаму цэнтру. Дзеці нават бралі ўдзел у навядзенні парадку ў новым будынку: яны прыбіралі класы і тэрыторыю, а старшакласнікі ўсталёўвалі мэблю.

А ў старым школьным будынку пасля рамонту размесціцца цэнтр пазашкольнай работы, які таксама вельмі патрэбны Клічаву.

**Алена КАЗЛОВА.**

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**
**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**
**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**
**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»**

**ГРАМАДСКІ САВЕТ:**
**МАЛАФЕЕЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;
**САСОНКА М. П.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;
**СЯЛІЦКІ В. С.,** старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;
**СІВАКОЎ В. А.,** старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;
**ЯРКОВІЧ В. І.,** старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

**АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.**
*Кантактны тэлефон 292-21-03.*

# КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 1 (13)

## Тарыфы на паслугі таксі ў сталіцы павялічыліся

**Вось ужо некалькі дзён як мінчане і госці сталіцы, што пажадалі скарыстацца паслугамі аўтамабіляў-таксі, мусяць плаціць за іх паслугі на 10—12 працэнтаў больш, чым было дагэтуль. У прыватнасці, калі да нядаўняга часу кошт аднаго кіламетра праезду складаў 980—1000 рублёў, дык цяпер пасажыр плаціць за тое ж ужо 1100 рублёў. Адпаведна, замест ранейшых 9800—10 000 рублёў за гадзіну прастою таксі з уключаным таксометрам цяпер кліент разлічваецца сумай на 1000 рублёў большай, чым раней,**

— Ініцыятарам павелічэння тарыфаў на паслугі таксі ў Мінску выступілі самі перавозчыкі, — пракаментаваў па просьбе рэдакцыі сітуацыю дырэктар Транспартнай асацыяцыі «Сталічнае таксі» Канстанцін Кузьмянкоў. — Прычынай была нізкая рэнтабельнасць прадпрыемстваў. Нагадаю, што апошні раз тарыфы на паслугі таксі павялічваліся больш за год таму.

Увогуле перавозчыкі прасілі (з улікам росту цэн на гаруча-змазачныя матэрыялы) тарыф у памеры 1200 рублёў за кіламетр праезду, аднак гэтае памкненне не было задаволена. Праўда, зазначыў далей Канстанцін Кузьмянкоў, адказваючы на пытанне журналіста «Звязды», у выпадку далейшага магчымага павелічэння цэн на гаруча-змазачныя матэрыялы сталічныя перавозчыкі зноў могуць звярнуцца да гэтага пытання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Шакалад — бандэролямі? А чаму б і не...

**Каля ста новых відаў прадукцыі засвоілі летась, дзякуючы праведзенай мадэрнізацыі вытворчасці, кандытарскія прадпрыемствы канцэрна «Белхарчпрам».**

Так, на фабрыцы «Спартак» напрыканцы года была запушчана лінія па выпуску кілаграмовага шакаладу трох найменняў: «Спартак. Горкі-Элітны» (з утрыманнем кава-прадуктаў не менш за 72 працэнты), «Спартак. Горкі» і «Спартак. Малочны». Шакалад змяшчаецца ў арыгінальную ўпакоўку ў выглядзе бандэролі з сургучнай пячаткай. СП ААТ «Івкон» наладзіла выпуск новай прадукцыі, узбагачанай вітамінамі і мінераламі, з дабаўленнем натуральных эфірных масел, экстрактаў з пладоў і ягад. На фабрыцы «Слодыч» была ўстаноўлена лінія па выпуску глазураванага і дэкарыраванага пячэння з рознымі пасыпкамі. Фабрыка «Конфа» пашырыла асартымент пячэння і пернікаў для хворых на фенілкетанурыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# НЯМА МАДЭМА— НЯМА І ПРАБЛЕМЫ...

## ...або як не трапіць на вуду да Інтэрнэт-піратаў

Рахунак на 2 мільёны рублёў за карыстанне Інтэрнэтам атрымала нядаўна адна беларуская сям'я. Зразумела, што такая сума ніяк не ўпісвалася ў сямейны бюджэт, таму прэтэнзіі былі выстаўлены «Белтэлекаму».

— На жаль, сярод нашых абанентаў шырока распаўсюджана меркаванне, што выстаўленне неабгрунтавана высокіх рахункаў за тэлефонныя перамовы ці Інтэрнэт — гэта вынік збою разліковай сістэмы апаратара сувязі, — **тлумачыць начальнік упраўлення інфармацыйных тэхналогій РУП «Белтэлекам» Уладзімір Пташнік.** — Аднак хачу запэўніць, што ўсе разлікі абапіраюцца на дадзеныя статыстыкі ўліковых сістэм, якія фіксуюць усе здзейсненыя спалучэнні абанента. На кожнай скарзе праводзіцца спецыяльная праверка, падчас якой высвятляецца, што з тэлефоннага нумара абанента на самай справе ажыццяўляліся міжнародныя званкі, праўда, абанент аб гэтым нават не здагадваўся, паколькі міжнародны нумар набіраўся не ўручную, а аўтаматычным мадэмам. Размова ў дадзеным выпадку ідзе праз так званае Інтэрнэт-пірацтва...

Найбольш распаўсюджаным відам Інтэрнэт-пастак з'яўляюцца разнастайныя «званілкі», калі карыстальніку прапануецца скачаць ці ўстанавіць тое ці іншае праграмнае забеспячэнне або паслугу. У момант запуску з камп'ютара абанента праграмы спалучэнне з мясцовым правайдарам разрываецца і па каналах сувязі мадэмам ажыццяўляецца прамое спалучэнне з серверам, устаноўленым у іншай краіне, пры гэтым далейшае знаходжанне ў Сусветнай павуціне аплачваецца па замежных тарыфах — ад 800 рублёў да 2 тысяч рублёў за адну хвіліну. Для прыкладу, вышэйзгаданая сям'я, як высветлілася, пастаянна трапляла ў Вялікабрытанію.

Штомесяц у «Белтэлекам» паступае 25—30 скаргаў на ўнушальныя тэлефонныя рахункі. У кастрычніку—лістападзе, калі ўся моладзь суткі напралёт сядзіць у Інтэрнэце, паток скаргаў расце, а летам, наадварот, змяншаецца.

Сумы, выстаўленыя ахвярам Інтэрнэт-піратаў летась, вагаліся ад 559 тысяч да двух мільёнаў рублёў. А адрасы іх «крыўдзіцеляў» знаходзіліся ў Бразіліі, Італіі, Нідэрландах, Сан-Марына, Літве, Вялікабрытаніі, Тога, Балгарыі, на астравах Кука і Вануату. Нядаўна Міністэрства ўнутраных спраў накіравала па каналах Інтэрпола запыт аб устанаўленні гаспадароў тэлефонных нумароў у Вялікабрытаніі і Нідэрландах, па якіх рэгулярна «званілі» беларусы. Дарэчы, праблема Інтэрнэт-пірацтва актуальная сёння для многіх краін, таму міжнародныя апаратары спрабуюць дамовіцца паміж сабой, як сумесна процістаяць махлярам. Праўда, хуткіх рашэнняў чакаць не даводзіцца, на гэта можа спатрэбіцца некалькі гадоў, а гэта значыць, што усе, хто трапіць на вуду да Інтэрнэт-махляроў у бліжэйшы час, вымушаны будуць плаціць за ўласную няўважлівасць са сваёй кішэні.

— Мы плацім за кожны званок, які ажыццяўляецца за межы Беларусі, і як камерцыйнае прадпрыемства не можам несці страты і пагашаць чужыя рахункі за міжнародныя перамовы, — тлумачыць сваю пазіцыю **начальнік Міжнароднага цэнтра камутацыі РУП «Белтэлекам» Сяргей Фурманаў.** — Усе ініцыіраваныя з вашага нумара тэлефона міжгароднія і міжнародныя спалучэнні падлягаюць тарыфікацыі і аплаце. Таму я параіў бы пры рабоце ў Інтэрнэце быць надзвычай асцярожнымі і вельмі ўважліва чытаць онлайнавыя аб'явы, прапанаваныя на англійскай мове.

Сваіх патэнцыяльных ахвяр Інтэрнэт-піраты чакаюць, як правіла, на Інтэрнэт-сайтах забаўляльнага (эратычнага і парнаграфічнага) характару, а таксама на сайтах, якія прапануюць «бясплатны сыр» — устаноўку некаторых неліцэнзійных і ўмоўна бясплатных праграм. Гэта могуць быць нават такія «бяскрыўдныя рэчы», як экранныя застаўкі... Пірацкія тэхналогіі не стаяць на месцы і пастаянна ўдасканальваюцца. Некаторыя з праграм запускаюцца і пачынаюць набіраць тэлефонныя нумары, калі камп'ютар на працягу пэўнага часу знаходзіцца ў рэжыме чакання (вы можаце піць каву, а ў гэты час ваш мадэм установіць міжнароднае спалучэнне). Існуюць таксама і камп'ютарныя вірусы, якія дзейнічаюць наступным чынам: калі абанент выходзіць у Інтэрнэт, вірус праз нейкі час абрывае сувязь і сістэма прапануе яшчэ раз устанавіць спалучэнне з вашым правайдарам, а далей вірус падмяняе нумар тэлефона правайдара і набірае тэлефонны нумар астравоў Кука ці іншых не менш экзатычных астравоў. Несанкцыянаваны дазвон можа быць здзейснены і пры спробе абанента зрабіць бясплатны міжнародны званок з дапамогай розных сайтаў IP-тэлефаніі. Такія праграмы могуць хавацца нават у рэкламных банэрах. «Клік» па банэру цягне адкрыццё вялікай колькасці вокнаў, якія карыстальніку вельмі цяжка закрыць, пасля чаго хуткасць з Інтэрнэтам прыкметна зніжаецца, а на камп'ютары з'яўляецца праграма-дазвоншчык.

На думку экспертаў, верагоднасць трапіць у Інтэрнэт-пастку ёсць нават у вопытных праграмістаў. Таму найбольш надзейны спосаб застрахавацца ад неапраўданых выдаткаў — гэта змяніць спосаб доступу ў Інтэрнэт. «Няма мадэма — няма і праблемы», — пажартаваў Сяргей Фурманаў. Паводле інфармацыі РУП «Белтэлекам», у 2005 годзе камуціруемым доступам у Інтэрнэт карысталіся каля 70 працэнтаў абанентаў, а летась іх колькасць зменшылася да 50—60 працэнтаў. Магчыма, калі-небудзь гэта праблема поўнасцю страціць для беларусаў сваю актуальнасць...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Каб не стаць ахвярай тэлефоннага махлярства, РУП «Белтэлекам» рэкамендуе прыняць наступныя меры засцярогі:**

- *Ведайце аб небяспецы загрузкі з сеткі Інтэрнэт розных праграмных прадуктаў. Уважліва чытайце онлайнавыя аб'явы. Пасткі могуць быць схаваныя на некалькі старонак далей у тэксце, які надрукаваны дробным шрыфтам. Не націскайце «ок», калі дакладна не ведаеце, з чым вы згаджаецеся.*
- *Сцеражыцеся праграм, якія дазваляюць вашаму мадэму ажыццяўляць набор нумара для доступу ў Інтэрнэт. Калі на экране вашага камп'ютара з'яўляецца дыялогавае акно з інфармацыяй аб тым, што ідзе набор нумара, які вы не даручалі яму набіраць, анулюйце злучэнне.*
- *Абавязкова ўключыце гук у настройках мадэма. Калі вы ўсё ж пачулі (па характэрнаму гуку), што мадэм адвольна ўстанаўлівае злучэнне — перапыніце працэдуру аж да адключэння мадэма ад тэлефоннай сеткі. Пасля гэтага абавязкова праверце настройкі «аддаленага злучэння па ўмаўчанню», наяўнасць новых злучэнняў і праграм (спасылак, ярлыкоў), якія вамі не ствараліся і не ўстанаўліваліся.*
- *Пагаварыце з дзецьмі, патлумачце ім небяспеку скачвання праграм. Кантралюйце сайты, якія яны наведваюць, правяраючы гісторыю наведвання вэб-сайтаў.*

*Праграмы такога кшталту, як правіла, не распазнаюцца антывірусным праграмным забеспячэннем і, адпаведна, не выдаляюцца. Трэба памятаць, што такія праграмы могуць не толькі ўстанаўліваць злучэнне, а і перадаваць вашы даныя (напрыклад, уліковы запіс для доступу ў Інтэрнэт) іншым карыстальнікам. Выдаленне такіх праграм сваімі сіламі — задача вельмі складаная. Для гэтага існуе спецыяльнае праграмнае забеспячэнне. Адна з лепшых распрацовак — утыліта SpyRemover кампаніі infoWorks Technology Company* ***(www.itcompany.com).***

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Інфакіёскі арганічна «ўпісаліся» ў дынамічнае жыццё мінчан

**У 2006 годзе беларусы ў тры разы часцей сталі выкарыстоўваць інфакіёскі для аплаты рахункаў за тэлефон. Для прыкладу, калі ў пачатку года праз інфакіёскі было здзейснена толькі крышку больш за 22 тысячы плацяжоў, то напрыканцы года — ужо больш за 60 тысяч.**

2005 год і ўвогуле пачынаўся са сціплай лічбы 899, а на канец года гэты паказчык вырас да 18 тысяч. Лідарам па электронных плацяжах з'яўляецца Мінск — менавіта жыхары сталіцы палову ўсіх разлікаў за тэлефон робяць з дапамогай пластыкавых картак.

Яшчэ адзін новы мабільны спосаб аплаты за тэлефон з'явіўся ў ліпені 2006 года. І хоць SMS-банкінг пакуль таксама не можа пахваліцца дзесяткамі тысяч здзейсненых з яго дапамогай плацяжоў, аднак ужо прасочваецца стабільны рост папулярнасці разлікаў з дапамогай мабільнага тэлефона.

У «Белтэлекаме» вельмі станоўча ставяцца да пашырэння спосабаў аплаты за хатні тэлефон. Паводле меркавання спецыялістаў, плацяжы з дапамогай сучасных тэхналогій у хуткім часе выдаляць з нашай памяці тыя чэргі, якія рэгулярна ўзнікаюць на пошце пры аплаце тэлефонных размоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Нумар мабільніка купілі ў Кітаі за 43 тыс. долараў

**Нумар мабільнага тэлефона, які ўтрымлівае шэсць «васьмёрак» запар, прададзены на аўкцыёне ў КНР за 43 тыс. долараў. Пакупніком стаў ананімны жыхар горада Наньчан, адміністрацыйнага цэнтра правінцыі Цзянсі ва ўсходнім Кітаі.**

Другі вынік паказаў нумар, які ўтрымлівае запар шэсць «дзевятак». Яго кошт склаў 16,5 тыс. долараў. Як сцвярджаюць арганізатары, усе даходы ад аўкцыёну пойдуць на сацыяльныя патрэбы.

У Кітаі традыцыйна з пашанай ставяцца да «васьмёрак» і «дзевятак». Лічба 8 сімвалізуе багацце і росквіт, 9 — сімвал Неба, вышэйшы сімвал, які азначае бясконцае мноства і вечнасць.

**Кар. БЕЛТА.**

## САМЫ ХАДАВЫ ТАВАР



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «БеСТ» прыйшоў у паўночную вобласць

У Віцебску паслугамі сотавай сувязі «народнага аператара» мабільнай сувязі «БеСТ» ужо карыстаюцца каля 2800 чалавек. «БеСТ» прыйшоў у самую паўночную вобласць краіны толькі ў жніўні 2006-га года.

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» кіраўнік Віцебскага філіяла кампаніі «БеСТ» Станіслаў Ляхоўскі, у бліжэйшы час «БеСТ» будзе дзейнічаць у Полацку, Наваполацку, Бешанковічах, Талачыне, Гарадку. У планах на сёлета — поўнае пакрыццё сувяззю ўсіх райцэнтраў Прыдзвінскага краю. Стаць абанентамі кампаніі, якая гарантуе надзейную і ўсім даступную мабільную сувязь, можна ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі, а таксама ў 16 дылерскіх пунктах, што працуюць па дагавору з «БеСТ»...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Пытальнік

## РАСПРОДАЖ НА ГАРАНТЫЙНЫЯ ТЭРМІНЫ НЕ ЎПЛЫВАЕ

**Напрыканцы года я набыла на распродажы ў гандлёва-выставачным комплексе зімовыя боцікі. Праўда, прадавец папярэдзіла мяне, што на тавары, якія прадаюцца па зніжаных цэнах, гарантыя не распаўсюджваецца. Я з ёй не пагадзілася, бо на распродаж быў выстаўлены якасны абутак. Для еўрапейцаў калядныя скідкі на прамысловыя тавары даўно сталі нормай, а ў нас гэта практыка яшчэ толькі пачынае прыжывацца. І прадаўцы, спадзеючыся на наіўнасць пакупнікоў, не саромеюцца парушаць іх правы. Ці я не праўду кажу?**

**Людміла Шаўковіч,** *г. Мінск*

Сапраўды, даволі часта на рэчавых рынках і выставачных комплексах пра зніжэнні цэн на абутак (як правіла, гэта робіцца на мяжы двух сезонаў для вызвалення складоў і гандлёвых плошчаў для новай сезоннай калекцыі, або напярэдадні святаў, каб павялічыць тавараабарот) індывідуальныя прадпрымальнікі або іх работнікі-прадаўцы інфармуюць пакупніка аб тым, што на гэты тавар гарантыйныя тэрміны не распаўсюджваюцца. Але гэта падман. Гарантыйныя тэрміны пашыраюцца на любы тавар, які рэалізуецца пакупнікам. Нават у тым выпадку, калі цана на абутак была зніжана па прычыне наяўнасці ў ім нейкага дэфекту, гарантыя не распаўсюджваецца толькі на гэты дэфект. Скажам, магазін мог уцаніць боцікі, у якіх былі ненадзейныя замкі-«маланкі», але ў працэсе эксплуатацыі ў боціках зламаўся не замок, а адваліўся абцас. У тым выпадку, калі экспертыза дакажа, што «аварыя» здарылася ў выніку дапушчанага вытворчага браку, то спажывец мае поўнае права прад'яўляць прэтэнзіі прадаўцу, які яму гэты тавар рэалізаваў.

Галоўнае — падчас ажыццяўлення пакупкі не забыць узяць у прадаўца чэк, дзе будзе пазначана дата вашай пакупкі. Для зімовага абутку гарантыйныя тэрміны бяруць адлік з 15 лістапада, для веснавога — з 1 сакавіка, для асенняга — з 15 верасня і для летняга — з 1 мая. Гэта асабліва важна для тых пакупнікоў, якія прызвычаіліся рабіць пакупкі на сезонных распродажах, бо актыўна эксплуатаваць сваю абноўку яны змогуць толькі праз некалькі месяцаў. Выключэнне складае мадэльны абутак, гарантыя на які бярэ адлік адразу пасля здзяйснення пакупкі. А даверлівасць і няведанне пакупнікамі сваіх правоў і на самай справе з'яўляецца для несумленных прадаўцоў сапраўднай знаходкай.

## ЦІ МОЖНА ВЯРНУЦЬ НЯЯКАСНЫ КАМП'ЮТАР ПРАДАЎЦУ?

**Наколькі я ведаю, згодна з Законам «Аб абароне правоў спажыўцоў», калі пакупніку быў прададзены тавар неналежнай якасці, то апошні мае права на замену нядобраякаснага тавару на тавар належнай якасці ці скасаванне дагавора аб куплі-продажы і вяртанне заплачаных прадаўцу грошай за тавар. У сувязі з гэтым у мяне ёсць пытанне. Некалькі месяцаў таму мы набылі дзецям камп'ютар, які ўжо двойчы ламаўся. У магазіне адмовіліся нам не толькі вярнуць за яго грошы, але і яго замяніць. Тлумачаць, што не маюць на гэта права...**

**А.В. Вайніла,** *г. Дзяржынск*

Уся праблема ў тым, што існуе зацверджаны ўрадам пералік тэхнічна складаных тавараў, якія можна замяніць толькі ў выпадку выяўлення ў іх істотных недахопаў. Да тэхнічна складаных тавараў адносяцца: аўтатранспартныя сродкі і намерныя агрэгаты да іх; матацыклы, матаролеры; снегаходы; прагулачныя катэры і іншыя плывучыя сродкі бытавога прызначэння; лодачныя матory; халадзільнікі і маразільнікі; пральныя машыны-аўтаматы; тэлевізары, відэамагнітафоны, відэаплееры, відэакамеры; бытавая вылічальная і капіравальная тэхніка, персанальныя камп'ютары і перыферыйныя прыстасаванні да іх, трактары, намерныя агрэгаты да іх, мотаблокі і мотакультыватары.

Пад істотным недахопам маецца на ўвазе недахоп, які немагчыма ўстараніць, ці недахоп, які нельга ўстараніць без несупастаўляльных расходаў або выдаткаў часу, недахоп, які выяўляецца неаднаразова або праяўляецца зноў пасля яго ліквідацыі. Факт немагчымасці ўстаранення недахопу можа быць пацверджаны заключэннем эксперта або заключэннем арганізацыі (прадпрымальніка), які ажыццяўляе тэхнічнае абслугоўванне або рамонт такога тавару. Для пацвярджэння факта паўторнага з'яўлення недахопу дастаткова мець даведку або квітанцыю аб устараненні гэтага недахопу раней, а таксама пацвярджэнне аб паўторным узнікненні недахопу. Асоба, якая займаецца ўстараненнем недахопу, можа зрабіць заключэнне, ці з'яўляюцца матэрыяльныя расходы і выдаткі часу на ліквідацыю недахопаў несупастаўляльныя з яго коштам. У тым выпадку, калі спажыўца не задаволіць заключэнне, ён можа аспрэчыць яго ў судовым парадку. Дарэчы, скасаваць дагавор аб куплі-продажы няякаснага тавару пакупнік таксама мае права.

## НЕ ЗРАЗАЙЦЕ МАРКІРОВАЧНЫЯ СТУЖКІ

**Я збіралася здаць у хімчыстку свой пінжак, пашыты з замшы. Але ў прыёмным пункце мяне папярэдзілі, што ніякай гарантыі на тое, што пінжак захавае свой колер, яны даць не могуць. Маўляў, на ім адсутнічае стужка з сімваламі па догляду вырабу. Але я асабіста заўсёды зразаю такія стужкі, бо як, скажыце, можна насіць адзенне з магазіннымі ярлыкамі?**

**М. Марэцкая,** *г. Гродна.*

На жаль, але спрачацца з работнікамі хімчысткі ў гэтым пытанні вельмі праблематычна, бо згодна з Правіламі бытавога абслугоўвання спажыўцоў, выканаўца вызначае від апрацоўкі вырабу ў адпаведнасці з сімваламі па догляду на маркіровачнай стужцы на адзенні. У выпадку частковай маркіроўкі ці адсутнасці маркіровачнай стужкі выканаўца мае права прыняць у кліента заказ без прадастаўлення яму гарантый якасці аказанай бытавой паслугі, аб чым ён абавязаны папярэдзіць і зрабіць адпаведную пазнаку ў дакуменце, які пацвярджае афармленне заказу. Пры афармленні заказу на аказанне бытавой паслугі па хімічнай чыстцы ці фарбаванню вырабу ў дакуменце, які пацвярджае заказ, павінны ўказвацца камплектнасць, колер, фурнітура, недахопы, якія не могуць быць выдаленыя пры хімічнай чыстцы і (ці) фарбаванні, а таксама дадатковыя платныя паслугі, якія аказваюцца толькі са згоды спажыўца. Выканаўца абавязаны прадаставіць спажыўцу па яго патрабаванню дакумент, на падставе якога выканаўца вызначае працэнт зносу вырабу, які прымаецца ў хімчыстку. Пры атрыманні вырабу з хімчысткі спажывец абавязаны праверыць па месцы выдачы заказу яго якасць, захаванне выходнай формы, цэласнасць, памер, колер малюнак і рэльефнасць вырабу.

Простыя рэчы

# ПАТЭЛЬНЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сярод першых кніжак, якія чыталі мы ў пачатковых класах, былі не толькі казкі. Старэйшыя хлопцы захапляліся Янкам Маўрам, яго «Палескімі рабінзонамі», кнігамі «Сын вады», «Чалавек ідзе», «Амок», «У краіне райскай птушкі». За імі цягнуліся і мы, хутка пераходзячы ад буйных шрыфтоў кніг-казак да драбнейшых шрыфтоў кніг прыгодніцкіх. І паходы нашы ў бібліятэку — акрамя падручнікаў кніг у нашых хатах не было — чаргаваліся з паходамі на прыроду. Ды не было таго разумення — прырода. На рэчку, у лес, на возера імчалі мы пасля чытання кніг. Бавіліся там больш, чым за кнігамі. І калі бацька ці маці пакінулі дома, даўшы нейкую работу, пасля яе ірваліся да сябрукоў. А знайсці іх было лёгка. Абегаў свае месцы — дзе-небудзь абавязкова напаткаеш кампанію.

Аднойчы кампанія гэта добра такі пацярпела ад свайго падсвядомага імкнення злучыцца з прыродай. Вырашылі ісці на рыбалку, але так, каб і гатаваць рыбу на беразе рэчкі. Нехта сцягнуў ад маці патэльню, нехта солі, нехта лою — алей тады быў дарагаваты. І вось скаламуцілі гліністае дно рэчкі, зацягнулі збіты з трох палак двайнічок, замест сеткі ў якім была марля. Але плотак, акунькоў, пічкуроў, нават шчупачкоў-ножычкаў налавілі дастаткова. Пачысцілі, выкінулі вантробы, распусцілі на патэльні лой. Насмажылі. Елі на беразе, адзін перад адным, упохапкі. Ды, відаць, недасмажылі. Уся кампанія вечар і ноч адпакутавала жыватамі. Толькі не сапсавала гэта настрою, не адрынула ад прагі новых падарожжаў і прыгод.

Патэльню я смела назваў бы карміцелькай-ласунняй. У чыгуне, каструлі гатаваліся стравы звычайныя, штодзённыя, а, калі пачынала сквірчэць скаварада — гэта ўжо нешта больш смачнае, а галоўнае смажанае. У гады майго дзяцінства дактары яшчэ не папярэджвалі строга, што смажаніна — ледзь не атрута для арганізма. У нашай мясцовасці, як і ўвогуле ў беларускай мове, бытавалі дзве назвы: і патэльня, і скаварада. Праўда, першая пераважала больш у вёсцы, а другая, далікатнейшая, у местачковым побыце. А ў ранейшай вясковай гутарцы выкарыстоўвалася яшчэ і назва «скварніца». На ёй скварылі, адсюль і любімая ўсімі беларусамі скварка, да якой пажадана, каб мелася чарка. Звернемся да «Новай зямлі» Якуба Коласа. Люблю гэту паэму, і цяпер падчас з асалодай перачытваю. Гэта сапраўдная энцыклапедыя беларускага вясковага жыцця на пачатку XX стагоддзя. Дык вось:

*Услон заняў сваё ўжо места,*
*На ім стаяла дзежка цеста,*
*І апалонік то і дзела*
*Па дзежцы боўтаў жвава, смела*
*І кідаў цеста ў скавародкі.*
*Давала піск яно кароткі,*
*Льючыся з шумам на патэльні,*
*І ў жар стаўлялася пякельны;*
*І там з яго ўжо ўвачавідкі*
*Пякліся гладзенькія плиткі*
*Блінцоў, спаднізу наздраватых,*
*Угору пышна, пухла ўзнятых,*
*І ўжо адтуль рукою маткі*
*На ўслон шпурляліся аладкі,*
*А дзеці іх даўно сачылі*
*І на ляту блінцы лавілі,*
*Заядла мазалі іх здорам...*

Перачытаў. І зразумеў, што для маладога беларуса патрэбны тлумачэнні. Мы ў сваім прырэчным гатаванні выкарыстоўвалі лой. Гэта нутраны авечы ці ялавічны тлушч. А ў Коласа — здор — унутраны свіны тлушч. І ў часы Коласавы, і ў нашы пяцідзесятыя—шасцідзесятыя гады мінулага стагоддзя менавіта тлушч выкарыстоўваўся для падмазкі патэльні пры выпяканні чаго-небудзь. Сёння, гледзячы на тэлевізійную рэкламу тэфалевых патэльняў, разумею, што некаму водар ад такой падмазкі будзе не зусім прыемным. Але ў тыя часы ён нас радаваў.

І сёння патэльня яечні з салам, цыбуляй, а калі яшчэ ёсць і са скрылёчкамі нарэзанай, пальцам пханай каўбасы — важны пачастунак і на вёсцы, і ў мястэчку. А як пра гэта прыгожа пісалі паэты.

*Хоць і незнаёмы госць*
*Для бацькоў, але —*
*Скварка і яешня ёсць*
*З чаркай на стале.*

**А. Куляшоў.**

Зімою, калі яшчэ толькі-толькі світае і ў хаце цемнавата, толькі агонь у печы асвечвае сцены, выйдзеш на панадворак, дзе чакаюць учора папілаваныя цурбакі бярозы, сасны ды вольхі — з задавальненнем памахаеш сякерай, нашчапаеш ладную гурбу дроў, пах ад якіх перабівае нават ранішні пах снегу. А тут і за стол клічуць, снедаць. І вялізная патэльня яечні на стале, водар ад якой цяпер перабівае ўсе іншыя. І квашаная капуста ў місцы. І запатнелая з холаду бутэлечка. Смаката!

Чым кормяць, ва ўсякім разе раней кармілі, салдат, вядома: «щи да каша — пища наша». Але некалькі разоў падчас службы даводзілася мець у аддаленых беларускіх вёсках незабыўныя сустрэчы, частавацца ў хатах. І тут не абыходзілася без патэльні. Тады і напісалася:

*І вось прыпынак вымушаны.*
*Восень.*
*Напяты ветрам*
*стогне небакрай.*
*І нас жанчына ветлая запросіць:*
*Сустрэне хата, нібы матчын рай.*
*Яечня з салам —*
*першы пачастунак,*
*Вясковы звычай —*
*лепшае гасцям...*

А скавароднік. Трэба патлумачыць, што гэта зусім не чапяла, якой бярэцца патэльня. Гэта старая страва, якую даводзілася і мне каштаваць. Рыхтуецца печыва з хлебнага цеста, якое яшчэ не падышло. Яго абгладжваюць вадой, тыкаюць пальцамі, каб не расколвалася. Сюды і бульбы можна дадаць. Пякуць на патэльні пры агні альбо на вуголлі. Называюць яго яшчэ праснаком, хапуном, сачэнем... Ды назваў хапае, ад чаго смак не горшае.

Што ж да чапялы, то так часам называюць і чалавека, які высокі і — няўклюдны. У Броўкі чытаем:

*Дзе ж Кузьма? Куды падзеўся?..*
*Дзе ты, злыдзень касавокі?*
*Хоць бы хто, як змёў віхор.*
*Чапяла старая толькі*
*Крадкам выпаўзла за двор.*

У народзе кажуць, што якімі б мы ні былі — зухаватымі ці чапёламі — павінны заўсёды клапаціцца аб душы, каб засталася яна да суднага дня чыстаю і бязгрэшнаю. Інакш у час суднага дня патрапяць грэшнікі ў пекла, а там — і на гарачыя патэльні. Што ж, як яшчэ кажуць, вольнаму — воля, а выратаванаму — рай.

**Алесь КАСЦЕНЬ,**
*Віцебская вобласць.*

Надзённае

## «Знімаючы стрэс» у адных, спіртное ператварае ў кашмар жыццё іншых

**Да адміністрацыйнай адказнасці за вытворчасць сурагатнага пойла на Гродзеншчыне ў 2006 годзе прыцягнута каля чатырох тысяч чалавек**

Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў намеснік начальніка УУС Гродзенскага аблвыканкама Іван Рыбак. Паводле яго слоў, на працягу года знішчаны 264 мінізаводы (іх не трэба блытаць з самагоннымі апаратамі ў бабулек за печкай), больш за 11 тон самагону і 180 тон самагоннай брагі.

— Наіўна думаць, што п'янства канкрэтнага чалавека з'яўляецца яго асабістай праблемай, — лічыць Іван Рыбак. — Трэба паслухаць мацярок і жонак, якія прыходзяць да святара, урача альбо начальніка райаддзела міліцыі з маленнем выратаваць сваіх блізкіх, пагартаць старонкі крымінальных спраў па злачынствах, што здзейснены «пад градусам», паглядзець фотабліцы аўтааварый па віне нецвярозых вадзіцеляў ці пешаходаў, азнаёміцца з гісторыямі хвароб алкаголікаў альбо тых, хто па прычыне ўжывання спіртнога атрымаў калецтва на рабоце.

«Знімаючы стрэс» у адных, спіртное пераўтварае ў кашмар жыццё іншых, хто знаходзіцца побач. Згодна з інфармацыяй Івана Рыбака, у стане ап'янення здзейснена больш за палову ўсіх цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, у тым ліку 80 працэнтаў забойстваў, 9 з 10 хуліганстваў, амаль тры чвэрці разбояў і каля двух трэціх згвалтаванняў. З іншага боку, ужыванне спіртнога не толькі правакуе людзей на правапарушэнні, але і ператварае іх у патэнцыяльных ахвяр. Нападпітку была амаль дзесятая частка пацярпелых ад злачынных замахаў, у адносінах п'янага здзейснены кожнае другое забойства і кожны чацвёрты разбой.

З 78 загінулых у Гродзенскай вобласці ад атручэння алкаголем 16 чалавек сталі ахвярамі спіртных сурагатаў. Усёй краіне вядомы ашмянскія атручэнні з далейшым развіццём у пацярпелых смяротнага таксічнага гепатыту. У лячэбныя ўстановы вобласці па дапамогу пры алкагольным атручэнні сурагатамі альбо ад передазіровак штогод накіроўваецца больш за паўтысячы чалавек. Прычым, лячэнне аднаго такога пацыента з ачысткай загаджанага спіртным арганізма каштуе бюджэту больш за 200 тысяч рублёў. Нашых з вамі рублёў...

Міністэрствам унутраных спраў аб'яўлена бязлітасная вайна з самагонаварэннем і іншымі дзеяннямі па кустарнаму вырабу спіртных напояў. Паводле інфармацыі Івана Рыбака, у кожным раёне Гродзеншчыны дзейнічае «гарачая лінія», на якую кожны, каму неабыякава здароўе бліжняга і ў цэлым нацыі, дабрабыт дзяржавы і бяспека нашых людзей на вуліцах, можа ананімна патэлефанаваць і паведаміць аб фактах не толькі самагонаварэння і незаконнага абароту спірту, але і аб парушэннях правілаў продажу алкагольных напояў у гандлёвых арганізацыях. Пры кожным райаддзеле міліцыі штосутачна працуюць па дзве рэйдавыя групы, якія не толькі рэагуюць на сігналы па «гарачай лініі», але і самастойна праводзяць вышуковыя мерапрыемствы па выяўленню фактаў незаконнага абароту алкагольных вырабаў. На абласную «гарачую лінію» ў Гродне (тэл. 79-73-33) ужо паступіла некалькі соцень званкоў і значная частка з іх пацвярджаецца. За актыўную дапамогу міліцыі ў барацьбе з «зялёным змеем» некаторыя грамадзяне начальнікам УУС Гродзенскага аблвыканкама заахвочаны грашовай прэміяй.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

***ДАРЭЧЫ***. *З самагоншчыкамі на Гродзеншчыне праведзены калектыўныя папераджальныя мерапрыемствы, на якія, акрамя ўрачоў-нарколагаў, былі запрошаны прадстаўнікі рэлігійных канфесій. Праводзяцца выязныя судовыя пасяджэнні па накіраванню алкаголікаў у ЛПП. Іншыя прафілактычныя меры выкарыстоўваліся ў старажытнай Спарце, дзе спецыяльна спойвалі рабоў, каб тыя сваім выглядам выклікалі ў юнакоў агіду да п'янства. А адна з першых пастаноў Савецкай улады ў 1917 годзе, як вядома, загадвала, што разграбленне вінных склепаў і магазінаў (заўважце, не ювелірных) будзе спыняцца кулямётамі без папярэджання.*

Інфарм-укол

## БЕЛАСНЕЖНЫЯ ТРЫЦЦАЦЬ ДВА

**Клінічная практыка паказвае, што дзесьці кожны пяты пацыент мае жаданне адбяліць зубы. Адбельванне забяспечвае эфект у 97 працэнтах выпадкаў. Новы колер застанецца стабільным на працягу года ў 90 працэнтаў пацыентаў, да сямі — у 35 працэнтаў. Незалежна ад метаду каркацыі, пацыент абавязкова павінен ведаць, што такое санацыя ротавай поласці.**



Прафесійная санацыя ўключае лячэнне ўсіх хворых зубоў і гінгівітаў — запаленняў дзясны, выдаленне зубнога каменя, пакрыццё зубных каранёў фторлакам. Індывідуальная гігіена прадугледжвае выдаленне мікробнага налёту з зубоў і дзяснаў рознымі сродкамі. Механічныя сродкі догляду — гэта зубныя шчоткі, ніткі, зубачысткі, ёршыкі, стымулятары, масажоры, ірыгатар, гігіенічныя і лячэбна-прафілактычныя — зубная паста, гель, эліксір, аэразоль, жуйка, гігіенічныя таблеткі, растворы.

Зубная шчотка бывае мяккай — для тых, у каго ёсць захворванні цвёрдых тканак зуба і слізістай, сярэдняй жорсткасці — для ўсіх і жорсткія — для тых, хто карыстаецца пратэзамі ці мае павышаную схільнасць да ўтварэння налёту. Мяняць шчотку трэба праз кожныя 1—2 месяцы. Аптымальны час чысткі зубоў — 2,5—3 хвіліны. А для ачышчэння налёту бакавых паверхняў зубоў і міжзубовых прамежкаў неабходна выкарыстоўваць зубныя ніткі, або флосы, якія накручваюць вакол першых фалангаў трэцiх пальцаў абедзвюх рук, фіксуюць пры дапамозе першага і другога пальцаў у міжзубным прамежку і робяць 6—7 вертыкальных рухаў.

У склад сучасных зубных пастаў уваходзяць злучэнні фтору, фосфару, кальцыю, антыбактэрыяльныя сродкі. Адным з вядучых метадаў прафілактыкі карыесу з'яўляецца ўзбагачэнне зубных пастаў фтарыдамі. Найбольш папулярныя пасты са фторам — Чабурашка, Фторадэнт, Signal, Pepsodent, Fluodent, Omnodent, Solly, Spacodent, Fluocaril, Colgate, Lunoplant. Ёсць пасты, у склад якіх уваходзяць экстракты лекавых раслін і эфірныя маслы. Яны спрыяльна ўздзейнічаюць на слізістую ротавай поласці і перыядонт, прыпыняюць кровацечывасць дзяснаў, зніжаюць запаленне, паляпшаюць абменныя працэсы ў тканках перыядонта. Напрыклад, "Лясная" паста валодае яскрава выражаным процізапаленчым і дэзадараваным уздзеяннем. Салявыя, содавыя пасты таксама спрыяюць паляпшэнню кровазвароту, перашкаджаюць утварэнню зубнога налёту.

Вылучаюць жа тры сістэмы адбельвання: прафесійнае ў клініцы, хатняе пад кантролем урача і з дапамогай адпаведных зубных пастаў. У першым выпадку гаворка ідзе пра аплікацыю канцэнтраваных, 30—35-працэнтных, раствораў перакісу вадароду, у другім — пра ўздзеянне 10—12-працэнтным перакісам карбаміду на працягу месяца гадзін. Зубныя пасты для адбельвання праяўляюць эфектыўнасць пры выкарыстанні іх пасля прафесійнага ці хатняга адбельвання. Падобныя працэдуры патрабуюць папярэдняга абследавання ў стаматолага з выяўленнем прычыны парушэння колеру, распаўсюджанасці пігментацыі.

Рызыка таксічнага ўздзеяння сродкаў для адбельвання на гены лічыцца, паводле шматлікіх даследаванняў, не істотнай, паколькі гаворка ідзе пра мінімальны кантакт з мяккімі тканкамі.

Маскоўскі рэпартаж

# НАСТАЛЬГІЯ ПА САЦЫЯЛЬНАЙ РОЎНАСЦІ

**Мы, група беларускіх журналістаў, напрыканцы мінулага года сталі сведкамі аднага з цікавых момантаў жыцця Масквы — неафіцыйнага святкавання 100-годдзя з дня нараджэння Л. І. Брэжнева. Здалёк такая ўвага да гэтай даты здавалася нечаканай і не зусім адэкватнай пасля той знішчальнай масавай крытыкі ў СМІ і грамадстве, якой даволі працяглы перыяд падвяргаліся кампартыя, ЦК КПСС, асоба генсека, яго бліжэйшыя паплечнікі і сваякі.**



*Л. І. Брэжнеў на схіле гадоў любіў з густам і нетаропка адпачыць і іншым не замінаў гэта рабіць.*

І вось у снежні 2006 года вядучыя расійскія тэлеканалы, друкаваныя выданні, паважаючыя сябе палітолагі і аналітыкі палічылі мэтазгодным адгукнуцца на юбілей былога генсека ЦК КПСС, настальгію народа па тым часе. Змест перадач і публікацый быў на здзіўленне прыхільным, я сказаў бы прыязным да спрэчнай постаці генсека і яго часу. У цэнтры сталіцы на Краснай плошчы ў дзяржаўным Гістарычным музеі прайшла выстава работ асабістага фатографа Брэжнева Ул. Мусаэльяна і прэзентацыя яго фотаальбома «Генсек і фатограф».

У гасцініцы «Арбат», дзе мы жылі, для пастаяльцаў былі выкладзены апошнія нумары газеты «Московские новости» і часопіса «Where Moscow» (з англійскай «Дзе Масква»). Апошні вабіў шыкоўным глянцавым бляскам і ўяўляў сабой багата ілюстраваны даведнік аб лепшых магазінах і рэстаранах сталіцы, яе славутасцях, месцах адпачынку. Ён — нібы капіталістычная вітрына горада, распаўсюджваецца ў першую чаргу сярод заможных пастаяльцаў дарагіх атэляў. А газета, як у лепшыя савецкія часы, інтрыгавала партрэтам Л.І. Брэжнева ў парадҥай маршальскай форме на ўсю першую паласу. Такім чынам, вобразна кажучы, сышліся сённяшняе і мінулае расійскай сталіцы.

Яшчэ штотыднёвік «Московские новости» (у мінулым адзін з самых жорсткіх і бескампрамісных крытыкаў шматлікіх памылак і пралікаў генсека і яго састарэлага палітбюро) у тым нумары надрукаваў некалькі аналітычных матэрыялаў на тэму 100-годдзя Брэжнева, у тым ліку і рэцэнзію на шэраг тэлеперадач да круглай даты. Што значыць гэты ўсплеск увагі да брэжнеўскага юбілею? Туга па «залатым часе» савецкай імперыі? Адкуль вытокі настальгіі?

Аб гэтым я спытаў першага намесніка старшыні Дзярждумы Расійскай Федэрацыі, лідара Ліберальна-дэмакратычнай партыі Уладзіміра Жырыноўскага. Ён даў даволі разгорнуты адказ. Калі сцісла, то раней, на яго думку, жылі хоць і небагата, многія ў камуналках, затое роўна, ціха і стабільна. Тады народу рэгулярна паведамлялі пра новы палёт у космас, новы завод, новы балет, новую электрастанцыю і г. д. А цяпер няма такіх дасягненняў. Раней хоць марудна, але рос дабрабыт насельніцтва, людзі паступова перасяляліся ў новыя кватэры, набывалі «жыгулі». Кожны мог адпачыць на поўдні каля мора. Цяпер гэта могуць дазволіць сабе далёка не ўсе, пашкадаваў народ Уладзімір Вольфавіч. Сёння народу, гаворачы яго мовай, псуюць настрой навінамі аб заказных забойствах банкіраў і незаказных жудасных забойствах святароў, катастрофах, гучных карупцыйных скандалах, сацыяльных трагедыях. Напрыклад, маштабных афёрах на рынку жылля, у выніку якіх моцна пацярпелі дзесяткі тысяч сем'яў. Самае цікавае, што на круок махляроў трапілі людзі вопытныя, якія ўважліва, нават з дапамогай юрыстаў да коскі і кропкі вывучылі дагаворы на будаўніцтва кватэры. І тым не менш...

Можа таму масквічы — недаверлівыя людзі. Многія з тых, з кім давялося размаўляць у Маскве, не вельмі перакананыя ў тым, што пад шыльдай абароны нацыянальных інтарэсаў Расіі валтузня вакол павышэння цэн на газ для Беларусі і іншых постсавецкіх рэспублік пойдзе на карысць звычайных расіян. Дадатковыя грошы ў асноўным дастануцца і без таго багатым айчынным і замежным акцыянерам «Газпрама», лічаць яны.

Настальгія па Брэжневу — гэта своеасаблівая рэакцыя масквічоў ды і ўсіх расіян на нябачанае дагэтуль сацыяльнае расслаенне, настальгія па былой сацыяльнай адноснай роўнасці. Хоць у Маскве самы высокі даход на душу насельніцтва — прыкладна 13 тысяч рублёў. Але гэты паказчык некаторыя сацыёлагі называюць «падманам сярэдніх лічбаў», бо ў адну кучу змешваюцца звышпрыбыткі алігархаў і рангам ніжэйшых багацеяў. У выніку атрымліваецца сімпатычная лічба. Хоць на самай справе вялікая колькасць маскоўскіх сем'яў жыве на 5—6 тысяч рублёў у месяц на чалавека, а 11 працэнтаў жыхароў сталіцы вымушаныя існаваць на суму каля 2 тысяч рублёў.

Тым часам сярод гарадоў свету Масква па колькасці мільярдэраў займае другое месца. Іх цяпер у першапрастольнай жыве 25, а наяўнасць «звычайных» мільянераў (зразумела, у доларавым вылічэнні) не паддаецца дакладнаму ўліку. У адпаведнасці з рынкавай логікай на задавальненне ўсялякіх патрэб заможных масквічоў, іх спажывецкіх капрызаў і фантазій скіраваны многія сегменты маскоўскага бізнэсу, у прыватнасці, сфера гандлю, паслуг, забаў, будаўніцтва элітнага жылля і г.д. Асабліва гэта відавочна на Цвярской (былой вул. Горкага).

Да сустрэчы ў Дзярждуме ў нас заставалася крыху менш за гадзіну і мы з калегам вырашылі прайсціся па Цвярской, зазірнуць у славуты Елісееўскі гастраном — у савецкія часы, бадай, самы вядомы магазін сталіцы. І ведаеце, не адразу яго адшукалі. Неяк ён згубіўся (ды і знутры выглядаў не так унушальна, як раней) на фоне шыкоўных буцікоў, ювелірных крамаў, фірмовых магазінаў сусветна вядомых вытворцаў дарагой парфумы, касметыкі, гадзіннікаў, іншых прадметаў раскошы. Цвярская зіхацела шыкоўнымі вітрынамі не горш чым самыя лепшыя вуліцы іншых еўрапейскіх сталіц.

Стаянкі ўздоўж Цвярской былі застаўлены, прама скажам нятаннымі (прыкладна ад 50 тыс. долараў і вышэй) іншамаркамі. Там-сям былі прыпаркаваныя «хамеры» — вялікія шырокія амерыканскія джыпы. Яны — новае захапленне багатых масквічоў. Хаця самы танны «хамер» каштуе мінімум 100 тысяч «зялёных» і вельмі дарагі ва ўтрыманні — «зжырае» 18—20 літраў бензіну на 100 км.

Масква перанасычана замежнай валютай. У цэнтры горада ў пунктах абмену аперацыі пачынаюць са 100 долараў. Менш не прымаюць. На выгадны курс абмену можна разлічваць пры продажы пачынаючы з 500 долараў.

Разам з тым масквічы любяць свой горад. Аб гэтым сведчаць і сацыялагічныя апытанні. Хоць з іншага боку, людзі надзвычай крытычна ставяцца да свайго роднага мегаполіса, называюць Маскву «не Расіяй, а іншым светам», «жорсткім горадам», «бандыцкім» і «карумпаваным».

Апошняя ацэнка справядлівая на 100 працэнтаў. Карупцыя ў Расіі і асабліва ў Маскве дасягнула каласальных памераў і ахапіла ўсе паверхі ўлады. У лістападзе мінулага года Генеральны пракурор Юрый Чайка, выступаючы ў Дзярждуме, адзначыў: апошнім часам прынята шмат карупцыйных законаў, што моцна замінае барацьбе з гэтым злом. Таму сёлета ўсе законапраекты будуць яшчэ праходзіць экспертызу і на карупцыйнасць.

Паводле даных іншага дэпутата Дзярждумы Уладзіміра Рыжкова, аб'ём карупцыі з 2001 года вырас у 7 разоў і летась склаў 214 млрд долараў ЗША, а гэта амаль увесь бюджэт Расіі. На федэральным узроўні ў сваю чаргу значна павялічылася сярэдняя сума хабару. Сёння яна складае 100 тысяч долараў ЗША. Палова дарагіх катэджаў вакол Масквы належыць чыноўнікам. Яны ж валодаюць значнай часткай нерухомасці ў Лондане.

Фонд «Індэм» называе яшчэ больш унушальныя лічбы. Паводле яго даных, у эканамічнай сферы сярэдняя сума хабару ўжо дасягае амаль 135 тысяч долараў. Агульны памер хабару ўзняўся амаль да 316 млрд долараў штогод! Гэта ў два разы больш за дзяржаўны федэральны бюджэт і ў 1,15 раза — за ўвесь дзяржаўны бюджэт (федэральны і рэгіёнаў) за 2006 год.

Малы бізнэс таксама вымушаны даваць хабар літаральна ўсім: чыноўнікам, міліцыі, суддзям, шматлікім правяраючым. Іх новыя шыкоўныя кватэры, машыны, дачы не могуць не выклікаць незадавальнення ў масквічоў, якія жывуць на адну зарплату. А такіх пераважная большасць. Раней (г.зн. пры Брэжневе), гавораць яны, падобнага разгулу карупцыі не было.

Рост сум хабару ў многім выкліканы павелічэннем колькасці служывага люду: цяпер яго ў тры разы больш, чым некалі ў Савецкім Саюзе. У выніку нядаўняй адміністрацыйнай рэформы колькасць чыноўнікаў істотна ўзрасла. А выдаткі на апарат дзяржкіравання (без утрымання судоў) павялічыліся ў 11 разоў!

Дэпутат Дзярждумы Валерый Рашкін заяўляе аб вялікай ступені карупцыйнасці партыі ўлады «Адзіная Расія». Паводле яго слоў, толькі за паўтара года яе члены былі асуджаны агульным тэрмінам на 590 гадоў.

Сацыяльнае расслаенне насельніцтва існуе паўсюдна і гэта з'ява аб'ектыўная. Іншая справа — яго маштабы. Ёсць такі паказчык — дэцыльны каэфіцыент (ДК). Яго яшчэ называюць каэфіцыентам Джэні. Ён адлюстроўвае ўзровень сацыяльнага расслаення — суадносіны даходаў 10 працэнтаў самых багатых і 10 працэнтаў самых бедных. Паводле афіцыйных даных, у цэлым па Расіі ДК складае 14,5—15, а ў Маскве — 43—45. Па некаторых даных — 50. Інакш кажучы, што 10 працэнтаў самых багатых жывуць у 50 разоў лепш, чым 10 працэнтаў самых бедных.

Для параўнання: у большасці еўрапейскіх краін ДК не перавышае 5. У Швецыі, напрыклад, 4. У развітых краінах крытычным паказчыкам, калі ўзнікае глеба для сацыяльных хваляванняў, лічыцца 7—10.

Але Масква — гэта, відаць, сапраўды, іншая планета. Апошнім часам там па аналогіі са славутым выразам «новыя рускія» з'явіўся не менш красамоўны — «новыя бедныя». Па іроніі лёсу ў гэту катэгорыю трапіла нямала тых, на кім усё трымаецца: работнікі бюджэтнай сферы, некаторых дзяржаўных прадпрыемстваў, выкладчыкі, медыкі, прадстаўнікі іншых звычайных прафесій. Залішне казаць, што яны — сярод тых, хто настальгуе па сацыяльнай роўнасці эпохі Брэжнева. Як і тыя, хто ў Расіі знаходзіцца за рысай беднасці. А іх — дзесяткі мільёнаў.

Павел Барадзін, дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, які не першы год жыве ў Маскве, працаваў у Крамлі на адказнай гаспадарчай пасадзе, ведае многія закулісныя механізмы і ценявыя бакі атрымання велізарных нелегальных даходаў у сталіцы. Сваімі ўражаннямі на гэты конт ён падзяліўся ў час сваёй нядаўняй прэс-канферэнцыі ў Маскве па выніках саюзнага будаўніцтва за мінулы год. Яму, напрыклад, спадабалася адна мініяцюра на канцэрце ў гонар чарговай гадавіны органаў дзяржаўнай бяспекі. Гумарыст пад апладысменты іх супрацоўнікаў ад імя тыповага для Расіі прайдзісвета забаўляў публіку смешнай гісторыяй аб тым, як ён удала за 20 капеек прыватызаваў буйное прадпрыемства і акцыянаваў яго. А потым прадаў дзяржаве за 20 мільярдаў.

Гэты «гумар» нагадаў Барадзіну выпадак з жыцця. Аднойчы ён прыехаў на вялікі авіяцыйны завод разам з намеснікам прэзідэнта вядомай авіябудаўнічай кампаніі «Аэрбас». Гаспадар завода з ліку «новых рускіх» між іншым паведаміў, што прыватызаваў свой завод за 32 мільёны расійскіх рублёў. У іншаземнага топ-менеджара вочы вылезлі: не можа быць! Завод, паводле яго ацэнкі, наўскідку каштуе 7—8 мільярдаў амерыканскіх долараў!

Барадзіну таксама «малазразумелы» лёс грошай ад спекуляцый кватэрамі і зямлёй у сталічным рэгіёне. Паводле яго слоў, бюджэт Масквы складае 18 млрд долараў ЗША. А толькі на рынку жылля «некаторыя таварышы» зарабляюць 12 млрд долараў ЗША. «Куды яны дзяваюцца?»

Бюджэт Маскоўскай вобласці, працягваў Барадзін, складае 3 млрд долараў ЗША. А даходы толькі ад продажу зямлі ў Падмаскоўі дасягаюць штогод 18 млрд долараў ЗША. Куды яны дзяваюцца, зноў задаваўся пытаннем дзяржсакратар і сам сабе адказаў у звыклай для яго манеры: відаць, Масква-рака змывае. Такі ж сумны лёс быць змытай хвалямі, на думку Барадзіна, чакае велізарныя прыбыткі ад здабычы нафты і алмазаў.

Ад сябе дадам, што попыт на падмаскоўную зямлю вялікі. На выездах са сталіцы вісяць расцяжкі-аб'явы: «Куплю зямлю. Дорага. Ад 5 га». І нумар тэлефона.

У Пал Палыча свой рэцэпт барацьбы з раскрадальнікамі народнага багацця.

«Калі б я быў начальнікам, то паставіў бы нашых мільярдэраў да сценкі, узвёў курок і сказаў: сволачы, досыць вывозіць 250—300 млрд долараў за мяжу. Укладвайце грошы ў Расію». Вось такое простае рашэнне складанай праблемы ад Барадзіна.

Масква, як і іншыя сталіцы, у многім вызначала і вызначае лінію паводзінаў і адносінаў усёй краіны да дзеючай улады і яе носьбітаў. Менавіта масквічы ў свой час пачалі здзекавацца ў шматлікіх з'едлівых анекдотах над палітычнай і фізічнай нямоглацю Л.І. Брэжнева, яго нездаровай прагай да славаслоўя і ўзнагарод, што забаўляла і адначасова на фоне пустых паліц магазінаў раздражняла народ. У кампаніях асаблівым поспехам карысталіся расказчыкі анекдотаў, якія ўдала імітавалі брэжнеўскую манеру гаварыць. Тады Масква рагатала над той уладай.

Цяпер тон калі не кардынальна, то істотна змяніўся. Народам Расіі спатрэбілася прайсці праз суровыя выпрабаванні «дзікім капіталізмам», каб зразумець, што многае з таго, чым варта было б даражыць, беззваротна страчана.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

Тэлесеткі

## «Дзелавое жыццё» заўважылі ў Міністэрстве эканомікі

Праграма Агенцтва тэлевізійных навінаў Белтэлерадыёкампаніі «Дзелавое жыццё» — дайджэст асноўных падзей у свеце эканомікі — існуе не так даўно, але ўжо заваявала пэўную аўдыторыю. А цяпер якасць праграмы, што называецца, пацверджана прафесіяналамі: «Дзелавое жыццё» стала пераможцам у рэспубліканскім конкурсе «Лепшае асвятленне і прапаганда ў СМІ прадпрымальніцкай дзейнасці».

5-хвілінны эканамічны агляд, які выходзіць штодзённа на Першым нацыянальным і «Беларусь-ТБ», быў прызнаны спецыялістамі Мінэканомікі лепшым у намінацыі «Дзяржаўная палітыка ў сферы малога прадпрымальніцтва». Яшчэ адзін праект БТРК, радыёпраграма «Уласная справа», якая выходзіць на Першым нацыянальным канале радыё, перамагла ў намінацыі «Чалавек справы».

Творчае спаборніцтва, абвешчанае Міністэрствам эканомікі Беларусі, паводле меркаванняў арганізатараў, павінна спрыяць усебаковаму асвятленню прадпрымальніцкай дзейнасці, стварэнню пазітыўнага іміджу нацыянальнага прадпрымальніцтва, а таксама адлюстраванню ролі прадпрымальніцкага сектара ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## МІКІТЫ ДЫ ДАР'І

Добра, што мода на замежныя імёны ў мінчан прайшла, — расказала спецыяліст ЗАГСа адміністрацыі Цэнтральнага раёна Вольга Скрыпко. — У мінулым годзе 41 хлопчыка назвалі Мікітамі і 37 дзяўчынак Дар'ямі. Цяпер сярод грудніčкоў — 35 Іванаў і 29 Настассяў. Замыкаюць спіс найбольш папулярных імёнаў Арцём, Ілья, Аляксандр і Марыя, Ганна, Кацярына.

**Галіна МАЛАХОЎСКАЯ, «Мінск—Навіны».**

## МІНІ-ЗАВОД НА КВАТЭРЫ?

У Віцебску ў звычайнай кватэры па праспекце Будаўнікоў міліцыянеры знайшлі 30 тысяч этыкетак гарэлкі «Пасольская», 5,5 тысячы коркаў. Беспрацоўная гаспадыня кватэры сказала, што ўсё гэта не яе. Маўляў, так, папрасілі схаваць...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Не падкормлівайце птушак смажанымі семачкамі!

**Сталічныя арнітолагі здзіўленыя тым, што да гэтага часу ў нашы краі не прыляцелі снегіры і амялушкі.**

— Звычайна ў снежні гэтыя птушкі накіроўваюцца ў Беларусь з Сібіры, але, відаць, іх пакуль палохае не па сезону мяккае надвор'е, — расказаў карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» дырэктар кальцавання птушак Інстытута заалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Павел Пінчук. — Затое ўсё больш лебедзяў і кулікоў застаюцца на зімоўку. У асноўным, гэта аслабленыя і хворыя птушкі, якія не ў сілах перамяшчацца на вялікія адлегласці.

Вучоны звярнуўся да мінчан з просьбай не падкормліваць птушак смажанымі семачкамі сланечніку і не частаваць лебедзяў чорным хлебам, пасля такой ежы яны толькі хварэюць.

**Галіна МАЛАХОЎСКАЯ, «Мінск—Навіны».**



Фота Пятра ФАМІНА.

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.24 | 16.10 | 7.46 |
| Віцебск — | 8.21 | 15.53 | 7.32 |
| Магілёў — | 8.14 | 16.00 | 7.46 |
| Гомель — | 8.03 | 16.04 | 8.01 |
| Гродна — | 8.38 | 16.26 | 7.48 |
| Брэст — | 8.31 | 16.34 | 8.03 |

### Месяц

***Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Шаляў.***

### Імяніны

***Пр.** Агафіі, Зіновія, Ігната, Нікандра, Пятра, Яфіма.*
***К.** Ады, Дануты, Адрыяна, Вільгельма, Рыгора, Яна.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| Горад | Тэмпература | Горад | Тэмпература |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +5 — +7 °C (Без ападкаў) | МАСКВА | +5 — +7 °C |
| ВІЛЬНЮС | +4 — +6 °C | РЫГА | +2 — +4 °C |
| КІЕЎ | +8 — +10 °C | С-ПЕЦЯРБУРГ | +2 — +4 °C |

## Дзве даты — 10 студзеня



**1569 год** — у Любліне пачаўся сейм, на якім разглядаліся пытанні цеснага саюза паміж Польшчай і Вялікім княствам Літоўскім. На ім абодва бакі прапанавалі свае ўмовы новай уніі. Прадстаўнікі Вялікага княства праявілі няўступлівасць, і пасля працяглых дэбатаў 1 сакавіка дэманстратыўна пакінулі сейм. Карыстаючыся гэтым, а таксама складаным становішчам ВКЛ, палякі дабіліся ад караля далучэння да каронных зямель значнай часткі заходніх і паўднёвых тэрыторый свайго саюзніка, у выніку чаго Вялікае княства Літоўскае страціла Падляшша, Валынь, Падолле і Кіеўшчыну. Яго межы звузіліся практычна да межаў сучасных Беларусі і Літвы. Гэта не магло не аслабіць дзяржаву, прадстаўнікі якой зноў былі вымушаны вярнуцца за стол перамоў. Люблінская ўнія была падпісана 1 ліпеня 1569 года.

**1863 год** — у Лондане адкрылася першая лінія першага ў свеце метро.

## Цытата дня:

***«Добры чалавек не той, хто ўмее рабіць дабро, а той, хто не ўмее рабіць зла».***

## УСМІХНЁМСЯ!

— А я сваёй каханай на Новы год падарунак пад елку паклаў!
— А яна што?
— А яна яго дагэтуль і шукае, тайга ж вялікая!

☺

**Учора была на рабоце навагодняя вечарынка. Самае яскравае ўражанне ў калег пакінулі не запрошаныя артысты і Дзед Мароз са Снягуркай, а тое, як я разбіў бутэльку Хеннэсі...**

☺

Мужык прачынаецца пасля Новага года са страшэннага пахмелля. Пытаецца ў жонкі:
— Новы год прайшоў?
— Прайшоў?
— А які сёння дзэнь?
— Другога студзеня.
— А першага было?

☺

**Надпіс на свечках ад гемарою: «Беражыце падсвечнік!»**

☺

Мужык падарыў цешчы на Новы год венік. Яна кажа, усміхаючыся:
— Гэта каб я часцей прыбірала?
— Не, гэта каб вы мяне чымсьці мякчэйшым білі, а то ўсё патэльняй ды патэльняй...



Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

аўта аматар

## Аўтаінфарм

### З ГОДАМ БЯСПЕКІ!

**Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі аб'явіла 2007-ы Годам бяспекі дарожнага руху.**

Як паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, на гэты год запланавана мноства мерапрыемстваў, у выніку рэалізацыі якіх колькасць загінулых у аўтаварыях павінна зменшыцца мінімум на 100 чалавек. Дарэчы, за апошнія 10 гадоў на дарогах Беларусі загінулі 17 165 чалавек і 71 498 — атрымалі раненні.

Між іншым, чытачы «Звязды» могуць накіроўваць у Дзяржаўтаінспекцыю **(220036 г. Мінск, вул. Грушаўская, 7, факс: 227-08-87)** свае прапановы і пажаданні наконт праграмы правядзення Года бяспекі дарожнага руху.

## Аўтагараскоп

### СЦЕРАЖЫСЯ ГРУЗАВІКА І... ЦЯГНІКА

**Самым распаўсюджаным відам ДТЗ на гэтым тыдні могуць стаць сутыкненні з вялікагрузнымі транспартнымі сродкамі і... цягнікамі. Прычым, як у населеных пунктах, так і за іх межамі. ДТЗ на пешаходных пераходах і перакрыжаваннях дарог могуць мець масавы характар. Таму ўсім вадзіцелям і пешаходам варта не толькі выконваць Правілы дарожнага руху, але і прымаць дадатковыя меры бяспекі...**

**10 студзеня** ў другой палове дня, каб пазбегнуць аварыйных сітуацый, вадзіцелям вельмі важна не парушаць правілы манеўравання, а пешаходам — цалкам адмовіцца ад перасячэння дарог у забароненых месцах.

У перыяд з 10 да 16 гадзін можа ўзнікнуць негатыўная рэакцыя на перашкоды на дарозе. У найбольшай небяспецы апынуцца жанчыны, якія будуць рабіць рызыкоўныя манеўры.

**11 студзеня** вадзіцелям неабходна запасціся цярпеннем, бо ўзнікне вялікая верагоднасць затораў у вузкіх месцах дарог. Небяспека падсцерагае падчас дажджу і снегападу.

Прычынай ДТЗ могуць стаць стомленасць, трывожнасць, а таксама агрэсія ў дачыненні да людзей процілеглага полу.

**12 студзеня** негатыўныя сюрпрызы можа прыпаднесці надвор'е. Найбольш уважлівымі і асцярожнымі трэба быць на дарогах з няякасным пакрыццём. Напрыканцы сутак павялічыцца верагоднасць аварый з вялікай колькасцю пацярпелых, асабліва на перакрыжаваннях другасных дарог з галоўнымі.

**13 студзеня** крытычныя сітуацыі могуць узнікнуць у шматлюдных месцах і на дарогах з інтэнсіўным рухам. У другой палове дня павялічыцца верагоднасць цяжкіх аварый па віне нецвярозых вадзіцеляў.

**14 студзеня** верагоднасць ДТЗ будзе залежаць ад выпадковых фактараў. Да такіх, напрыклад, адносяцца стыхійныя бедствы альбо масавыя беспарадкі. У мэтах бяспекі рэкамендуецца пазбягаць узаемадзеяння з людзьмі, якія не ўмеюць стрымліваць свае эмоцыі і кантраляваць паводзіны.

## Аўталікбез

### «АПАТЫЯ» НА КОЛАХ

**Вось ужо сапраўды фантазія вынаходнікаў колераў для аўтамабіляў не ведае межаў і не мае часам лагічнага тлумачэння. Таму мы працягваем «раскадзіроўку» экзатычных аўтафарбаў.**

«Нарцыс» — яркі, насычаны жоўты неметалік (код 223), «Няптун» — цёмна-шэры металік з сінім адценнем (код 628), «Акіян» — сіне-фіялетавы неметалік (код 449), «Апатыя» — металік колеру охры (код 286), «Апал» — серабрысты металік з блакітным адценнем (код 419), «Папірус» — шэры металік з лёгкім жоўтым адценнем (код 387), «Пірана» — чырвона-карычневы металік (код 795), «Піцунда» — зялёна-блакітны неметалік (код 417), «Прыз» — металік плацінавага колеру (код 276), «Прымула» — жоўта-белы неметалік (код 210).

## Аўтадаследаванне

### СПАЧАТКУ ЭКАНОМНАСЦЬ, ПОТЫМ ЯКАСЦЬ

**Важнейшым фактарам пры выбары аўтамабіля для большасці жыхароў планеты становіцца расход паліва.**

Да такой высновы прыйшлі спецыялісты кансалтынгавага агенцтва KPMG, апытаўшы 150 топ-менеджараў аўтапрама. 89 працэнтаў рэспандэнтаў паставілі на першае месца менавіта эканомнасць аўтамабіля. Крытэрый якасці апынуўся на другім месцы, бяспекі — на трэцім, даступнай цаны — на чацвёртым.

## Аўтасалон

### «MERCEDES» — ДОБРА, А «CHEVROLET WOLT» — ЛЕПШ

**У Дэтройце адкрыўся міжнародны аўтасалон. Буйнейшае ў свеце шоу матораў сёлета адзначае свой 100-гадовы юбілей. Яшчэ адным юбілярам стаў поўнапрывадны аўтамабіль «Mer-cedes». Яму таксама споўнілася роўна 100 гадоў. З гэтай нагоды кампанія «Mercedes» прадставіла на аўтасалоне некалькі навінак: поўнапрывадныя ўсюдыходы і седаны, якія прадэманстравалі публіцы «танцы на лёдзе».**

Зрэшты, найбольшую цікавасць публікі выклікаў электрамабіль «Chevrolet Wolt». Ён працуе на батарэі, якую можна цалкам зарадзіць за 6 гадзін у хатніх умовах, уключыўшы ў звычайную бытавую разетку. Вось толькі невядома, калі гэты электрамабіль будзе запушчаны ў серыйную вытворчасць.

## Аўтажарт

*Сябры пытаюцца ў Вовачкі:*
*— Што табе бацькі падарылі на дзень нараджэння?*
*— Бачыце, вунь той чорны «Mercedes»?*
*— Ага! Шыкоўная машына!*
*— Вось дакладна такога ж колеру шапку...*

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.093. Індэкс 63850. Зак. № 152. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12